

РОДЫ...
ПА
ПЛАНЕ
Сямейная газета

ДОЧКІ-МАЦІ
СА СВЯТЛАНАЙ
БАРОЎСКАЙ
Сямейная газета





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 163 (29030)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДВОРНІК, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мы з кожным годам даём магчымасць прыватнаму бізнесу развівацца. Калі ў грамадскім сектары сёння вырабляем 1 млн тон бульбы, то ў цэлым ва ўсіх катэгорыях — 6 млн тон. Гэта сведчыць аб тым, што фермеры, прыватныя асобы займаюцца вытворчасцю не толькі для сябе, але і на продаж. Значыць, гэта ўжо бізнес. Тое ж самае адбываецца і па агародніннных культурах. Мы даём магчымасць прыватніку зарабіць і бачым, што ў гэтым напрамку ідзе добры рух. Дарэчы, сёлета будзе атрымана больш прадукцыі ва ўсіх галінах сельгасвытворчасці, чым летась. Закладка стабфондаў будзе забяспечана ў поўным аб'ёме».*

# СЦЯНА ПАМЯЦІ




**Жыхары вёскі Хралы не забываюць пра пакуты і гора, якія прынесла ім вайна. Памятаюць і пра сваіх аднавяскоцаў ветэранаў — партызанаў і франтавікоў. Пра гэта сведчыць вясковая сцяна памяці — яна на адным з дамоў. На гэтым мемарыяле пазначаны імёны і прозвішчы і тых, хто не дажыў да Перамогі, склаўшы галаву на полі бою, закатаваных у час карнай экспедыцыі супраць мірнага насельніцтва. Жыхары Мінска Аляксандр САВІШЧАЎ і Вікторыя ШКАРУПА (на фота), наведаўшы Глыбоцкі раён, зацікавіліся гісторыяй Хралоў, даведаліся, што ў вайну гэты населены пункт быў цалкам знішчаны, але, нягледзячы на галодны і неспрыяльны час, Хралы ўсё-такі вярнуліся з небыцця. Каб памятаць.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Вучэбныя эвакуацыі пройдуць у школах 9—10 верасня падчас акцыі «Адзіны дзень бяспекі».
- **У Жыровічах пасля рэканструкцыі ўчора адкрылі святую крыніцу.**



- Белкаапсаюз закупіў у гэтым сезоне ўжо больш за 3,4 тысячы тон таматаў.
- **Да 31 градуса спёкі чакаецца сёння на паўднёвым захадзе Беларусі.**
- Зніклую 19 жніўня ў Гродне 15-гадовую дзяўчыну знайшлі ў Бераставіцкім раёне: яна хавалася ў лесе разам са сваім хлопцам.


ISSN 1990 - 763X


Актуальна

# ШКОЛЫ ГАТОВЫ! А ВЫ?

**Новы навучальны год хутка пачнецца для больш чым мільёна беларускіх школьнікаў. Пра тое, дзе адкрыюцца новыя школы і якія змяненні адбыліся ў навучальных праграмах і падручніках, а таксама пра стварэнне роўных умоў для вучняў школ і гімназій расказалі спецыялісты Міністэрства адукацыі.**

### Дзе адкрыюцца новыя школы?

У новым навучальным годзе ў Беларусі справяць наваселле восем школ. Сем з іх адчыняць свае дзверы ўжо з пачатку навучальнага года. Дзве школы пабудаваныя ў новых мікраараёнах сталіцы, яшчэ дзве — у Брэсце, па адной адкрыецца ў Гродне, Астраўцы і Магілёве. У іх сядзе за парты 7 288 школьнікаў.

— Напаўняльнасць новых школ разлічвалася ў залежнасці ад запатрабаванасці ў тым ці іншым мікраараёне, пры праектаванні ўлічваліся і перспектыва развіцця раёна, — адзначае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.** — Напрыклад, адна са школ Брэста разлічана на 1 480 месцаў, другая — на 470. У Магілёве новая школа прыме 1 020 вучняў.

У Мінску сярэдняя школа № 93 на 792 месцы прыме школьнікаў з мікраараёна Уручча (Першамайскі раён). У мікраараёне Сухарава 1 020 вучняў пойдуць у новую сярэднюю школу № 2 (Фрунзенскі раён). Як адзначыла Ірына Каржова, усе новыя школы — гэта сучасныя будынкі, аснашчаныя ўсім неабходным для правядзення вучэбнага працэсу, заняткаў спортам і пазакласных мерапрыемстваў.


СТАР. 4


# З ХЛЕБАМ, БУЛЬБАЙ І ЦУКРОВЫМІ БУРАКАМІ



У адной з найлепшых гаспадарак Магілёўскага раёна ААТ «Цішоўка» распачалі ўборку другога хлеба

**Аграном Аксана Таўшканава працуе ў цэйтноце і асаблівай радасці ад увагі журналістаў не адчувае. На старэнькіх «Жыгулях» яна лётае па бясконцых «цішоўскіх» палях (ад аднаго краю да другога 50 кіламетраў) і не паспявае даваць і кантраляваць заданні. Жніво закончылася, але часу адпачываць няма. «З сакавіка да лістапада з палёў не вылазім», — уздыхае яна. Вытанчаная, са смуглым ад пастаяннай работы пад сонцам тварам, яна здаецца зусім яшчэ дзяўчынкай. Але колькі ў голасе рашучасці, шчырай трывогі за ўраджай. Перш-наперш мы едзем глядзець, што робіцца на бульбяных палетках. Гаспадарка, дарэчы, спецыялізуецца на вырошчванні сорту «Брыз».**

### УРАДЖАЙ — СПРАВА ТОНКАЯ

Па бульбяным полі плошчай 150 гектараў жвава імчыць трактар. За рулём вопытны **кіроўца Дзмітрый ФІЛІМОНАЎ.** Ад работы адрывацца толькі на хвіліну, каб перакінуцца парай фраз. Ён у гаспадарцы працуе з 18 гадоў, у якасці трактарыста — чатыры апошнія.


СТАР. 13

# ВЫНІКІ — ДОБРЫЯ, ПЕРСПЕКТЫВЫ — ЯШЧЭ ЛЕПШЫЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Казахстан Ермухаметам Ертысбаевым, які завяршае сваю місію ў нашай краіне.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што паміж Беларуссю і Казахстанам выбудаваны адносіны, якія дазваляюць шматкроць перавысіць наяўны эканамічны вынік.

— У нас надзвычай добрыя адносіны з Казахстанам, іх можна параўнаць толькі з адносінамі паміж Беларуссю і Расіяй. Мы ўтрох заўсёды былі ініцыятарамі самых лепшых стасункаў паміж народамі, асабліва пасля распаду Савецкага Саюза, — сказаў беларускі лідар. — Заўсёды ініцыявалі інтэграцыйныя працэсы, блізкае супрацоўніцтва ў эканоміцы. Эканоміка — гэта фундамент усяго, без яе няма дыпламатыі і палітыкі.

У гэтым плане Беларусі няма ў чым папракнуць Казахстан, як і Казахстану Беларусь, дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Але перспектывы і магчымасці ў нас яшчэ больш важкія, чым вынікі, якіх мы дасягнулі. Вы, як пасол, самі цудоўна разумееце, што з такой прасунутай інтэграцыяй, якая ў нас з вамі існуе, мы не павінны казаць пра мільярд тавараабароту — гэта павінны быць мільярды долараў, і мы гэта можам зрабіць», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка не сумняваецца, што пад кіраўніцтвам новага Прэзідэнта Казахстана Касыма-Жамарта Такаева добрыя адносіны гэтай краіны з Беларуссю будуць захаваныя.

Прэзідэнт Беларусі папрасіў перадаць віншаванні і добрыя пажаданні свайму казахстанскаму калегу, а таксама прывітанне і пажаданні добрага здароўя былому кіраўніку краіны — Нурсултану Назарбаеву, якога назваў сваім даўнім сябрам, з якім «з'едзены не адзін пуд солі». Ён дадаў, што ў найбліжэйшы час будзе магчымасць пабываць у Казахстане і абмеркаваць увесь комплекс двухбаковых адносін.

Ермухамет Ертысбаеў прызнаўся, што пакідае Беларусь са змешанымі пачуццямі, бо тут на некаторы час застаецца яго жонка, якая ўлюбілася ў гэтую краіну.

«З 23 мая, калі мы апошні раз сустракаліся, прайшло тры месяцы і дзякуючы вам (вялікі вам дзякуй ад нашай краіны) на 40 працэнтаў павялічыўся казахстанскі экспарт у Беларусь, — сказаў Ермухамет Ертысбаеў. — Думаю да канца кастрычніка, калі адбудзецца ваш афіцыйны візіт у Казахстан, гандлёвы баланс яшчэ больш палепшыцца, спадзяюся, вы не будзеце супраць, бо штогод сальда складалася для нас адмоўным у памеры 750—800 мільёнаў долараў».

Казахстанскі дыпламат назваў кіраўніка Беларусі палітыкам з сусветным імем. «Я ўжо зрабіў шмат публікацый у казахстанскай прэсе пра беларускую сацыяльна-эканамічную мадэль, цяпер буду рабіць іх яшчэ больш, бо шчыры прыхільнік вашага палітычнага таленту», — прызнаўся ён.

Адносіны паміж Беларуссю і Казахстанам заўсёды будуць брацкімі, сяброўскімі і рэнтабельнымі, выказаў упэўненасць Ермухамет Ертысбаеў журналістам пасля развітальнай сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы.

«У нас наладжана супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, у тым ліку гуманітарнай, — дадаў ён. — Адносіны казахска-беларускія — гэта эталон адносін паміж дзяржавамі. Пасля распаду Савецкага Саюза мы — Беларусь і Казахстан — паказалі, як трэба будаваць двухбаковыя брацкія, сяброўскія стасункі».

**Да ведама**

Па выніках мінулага года тавараабарот паміж Беларуссю і Казахстанам дасягнуў 896 мільёнаў долараў (130 працэнтаў да ўзроўню 2017 года), сальда для нашай краіны станоўчае ў памеры 671,4 мільёна долараў. Узаемны гандаль працягнуў рост і сёлета за шэсць месяцаў года склаў 481,7 мільёна долараў (118,8 працэнта да аналагічнага перыяду летась).

Ключавымі пазіцыямі беларускага экспарту ў 2019 годзе сталі трактары і сядзельныя цягачы, малако і малочныя прадукты, масла, машыны для ўборкі сельскагаспадарчых культур, калійныя ўгнаенні, мэбля, ялавічына, грузавыя аўтамабілі, сыры і тварог.

Аснову імпарту з Казахстана сфарміравалі нафтапрадукты, каменны вугаль, нафтавыя газы, баваўнянае валакно, насенне льну, неапрацаваны алюміній.

Пасол пацвердзіў, што сёлета ў канцы кастрычніка чакаецца візіт кіраўніка Беларусі ў Казахстан. «Гэты візіт канчаткова замацуе тое стратэгічнае партнёрства, якое намечана, і выведзе на новыя якасны этап нашы адносіны», — падкрэсліў Ермухамет Ертысбаеў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ТАВАРААБАРОТ МОЖНА ПАВЯЛІЧЫЦЬ У РАЗЫ

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Турэцкай Рэспублікі Меўлютам Чавушаглу.**

Беларускі лідар адзначыў, што паміж Беларуссю і Турцыяй няма закрытых тэм. «Мы прайшлі вельмі доўгі і няпросты шлях. Перад намі стаялі розныя выклікі, і розныя пытанні мы з вамі вырашалі. І трэба аддаць належнае, што мы паспяхова вырашалі праблемы, якія ўзнікалі», — сказаў ён.

Але працаваць ёсць над чым, дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Нам, канешне ж, трэба ўдасканальваць фундамент нашых адносін — гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Такія краіны, як мы — Турцыя і Беларусь, — маюць вялізны патэнцыял у сваім развіцці, могуць мець у разы большы тавараабарот, чым зараз. Скажу вам шчыра: у нас, можна сказаць, нейкая блытаніна тут, і наша міжурадавая камісія, нашы пасольствы павінны падключыцца і нарэшце выпрацаваць надзейны план дзеянняў. Пагадзіцеся, калі тавараабарот вялікі, калі мы вельмі залежым адзін ад аднаго, то ўжо нікому не ўдасца разарваць адносіны», — аргументаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік Беларусі выказаў упэўненасць, што візіт міністра замежных спраў Турэцкай Рэспублікі ў Мінск будзе садзейнічаць сістэматызацыі двухбаковых адносін, рашэнню існуючых праблем. «Галоўнае, каб вы адкрыта іх абазначылі, а мы з разуменнем змаглі на гэта адрэагаваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Міністр замежных спраў Турэцкай Рэспублікі перадаў Аляксандру Лукашэнку прывітанне ад яго турэцкага калегі і сябра Рэджэпа Таіпа Эрдагана.

«Гэты візіт мы ажыццяўляем, каб сумесна з нашымі беларускімі калегамі знайсці спосабы дасягнуць высокіх мэт і вынікаў, якія былі пастаўлены вамі і Прэзідэнтам Турцыі», — растлумачыў Меўлют Чавушаглу.

**Да ведама**

У 2018 годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Турцыяй дасягнуў 984 мільёны долараў, сальда для нашай краіны склалася адмоўнае ў памеры 619 мільёнаў долараў.

Аснову беларускага экспарту ў Турцыю сфарміравалі прадукцыя хімічнай прамысловасці, калійныя ўгнаенні, паўфабрыкаты і дрот з нелегіраванай сталі, масла, льняныя тканіны. Імпартаваліся трыкатажныя палотны і тканіны, таматы, яблыкі, грушы, гародніна. Сёлета дынаміка тавараабароту, а таксама ўзаемны гандаль паслугамі запаволіліся. Аб'ём турэцкіх інвестыцый у эканоміку Беларусі летась склаў 43 мільёны долараў.

***

Учора **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** правёў перагаворы са сваім турэцкім калегам Меўлютам Чавушаглу. Кіраўнік МЗС Беларусі звярнуў увагу, што Турцыя — асноўны партнёр нашай краіны ў рэгіёне, з якім няма прынцыповых рознагалоссяў у міжнародных пытаннях. Трывалым сувязям спрыяюць наладжаныя кантакты на ўзроўні прэзідэнтаў, парламентаў і ўрадаў. У гэтым кірунку Уладзімір Макей анансаваў афіцыйны візіт у Беларусь у верасні старшыні Камісіі па замежных справах Вялікага нацыянальнага сходу (парламента) Турцыі Валкана Базкыра.

Асноўныя тэмы перагавораў міністраў — нарошчванне тавараабароту, зніжэнне дысбалансу ў гандлі, павелічэнне інвестыцый і колькасці сумесных эканамічных праектаў.

«Мы прыйшлі да высновы, што ў нас шмат нявыкарыстаных магчымасцяў для пашырэння супрацоўніцтва ў розных сферах», — перадае словы Уладзіміра Макея БелТА.

Ён таксама паведаміў аб дамоўленасці з Турцыяй правесці ў найбліжэйшы час шэраг сустрэч і перагавораў у розных фарматах для павелічэння эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Выбары-2019

# Чужыя грошы лічыць не будзем

## Звесткі пра даход кандыдатаў прадстаўляюцца, але не выдаюцца

**На кожных выбарах ЦВК тлумачыць парадак дэкларавання даходаў і маёмасці асобамі, вылучанымі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, вызначае парадак карыстання сродкамі масавай інфармацыі, зацвярджае палажэнне аб выбарчым фондзе.**

Даходы прэтэндэнтаў на кандыдацтва дэкларуюцца за 2018 год, а маёмасць — на дзень прадстаўлення дэкларацыі. Асобы, у якіх не было даходаў у гэты перыяд, павінны ўказаць крыніцу сродкаў існавання. Пра гэта паведаміла на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў **загадчык аддзела прававой, аналітычнай і метадычнай работы апарату Цэнтральнай камісіі Галіна МКРТЫЧАН.**

Са з'яўленнем закона аб ахове персанальных даных ЦВК апынулася ў складаным становішчы: з аднаго боку, абавязак правярць наяўнасць у кандыдатаў, напрыклад, каштоўных папер, з другога — закрытасць гэтай інфармацыі.

Звесткі, якія ўтрымліваюцца ў дэкларацыях, адносяцца да персанальных. Іх запытваюць грамадскія органы, якія не маюць права распаўсюджацца закрытай інфармацыяй, асабліва звесткамі пра акцыі. Таму Дэпартамент па каштоўных паперах будзе адказваць камісіям толькі тое, у якім памеры (большым ці меншым) паказаныя акцыі.

«Форма ўласнасці прадпрыемства можа змяніцца, і кандыдат нават не будзе ведаць сумавае выражэнне сваіх акцый. Таму, калі ён паказаў у большым памеры, а насамрэч іх меней і гэта ўказаў дзяржаўны орган, гэта лічыцца неістотнай памылкай. А вось калі занізіў колькасць акцый — гэты выпадак ужо разглядаецца камісіяй як істотная памылка пры прадстаўленні дэкларацыі. Натуральна, выбаршчыкам гэта інфармацыя будзе даводзіцца ў вельмі агульным памеры: толькі тое, што паказаў сам кандыдат. Таму што ўстанавіць дакладную інфармацыю нам не дазваляе закон», — звярнула ўвагу **старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА.**

### На знаёмства — пяць хвілін

«Звязда» будзе бясплатна друкаваць перадвыбарныя праграмы кандыдатаў. Другой рэспубліканскай газетай для гэтых мэт вызначана «Рэспубліка», а таксама абласныя, раённыя і гарадскія выданні. СМІ засталіся тыя ж, што ў 2016 годзе. Аб гэтым расказала **сакратар ЦВК Алена ДМУХАЙЛА.**

Тэкст праграмы кандыдаты павінны прадставіць у рэдакцыі да 27 кастрычніка — не пазней, чым за дваццаць дзён да выбараў. Раней будуць надрукаваныя праграмы, якія першымі паступілі.

Надрукаваць праграму кандыдат можа толькі аднойчы. Як і ў папярэдню кампанію, для кантролю на сайце ЦВК будзе створаны спецыяльны раздзел, у якім рэдакцыі змогуць даведацца, ці друкаваўся ўжо кандыдат.

Кандыдаты ад Мінска змогуць выступіць у эфіры тэлеканала Беларусь 3 і радыёстанцыі «Радыё Мінск», ад Мінскай вобласці — у эфіры Сталічнага тэлебачання і радыёстанцыі «Мінская хваля», кандыдаты ад іншых абласцей могуць карыстацца эфірамі абласных тэлерадыёкампаній. Аналагічна было на выбарах у 2016 годзе.

У кожнага прэтэндэнта на дэпутацкі мандат будзе пяць хвілін на тэлебачанні і пяць хвілін на радыё, такі ж тэрмін прадугледжаны для тэледэбатаў.

«З аднаго боку можа падацца, што гэта не вельмі шмат, але досвед паказвае, што кандыдаты нават у пяціхвілінных выступленнях не ўсе ўдзельнічаюць, а ў тэледэбатах і пагатоў. Каб утрымліваць увагу аўдыторыі, выступленне павінна быць яркім, запамінальным. Пяці хвілін для гэтага дастаткова», — выказала меркаванне Алена Дмухайла.

Яна дадала, што выступленні пройдуць у рэйтынгавы час — па будных днях з 19 да 20 гадзін па ТБ, з 7 да 8 гадзін па радыё з 21 кастрычніка да 6 лістапада. У выступленнях кандыдат удзельнічае выключна асабіста, а на тэледэбаты можа накіраваць давераную асобу.

ЦВК на сваім пасяджэнні прыме пастанову аб размеркаванні эфірнага часу паміж акруговымі выбарчымі камісіямі, калі стане вядома прыблізная колькасць кандыдатаў па кожнай акрузе, — пасля завяршэння прадстаўлення дакументаў для рэгістрацыі кандыдатаў. Жараб'ёўку правядуць не пазней за 18 кастрычніка.

Тэлевізійныя выступленні абавязкова будуць суправаджацца субцітрамі ці сурдаперакладам.

Для вырашэння канфліктаў, звязаных з карыстаннем сродкамі масавай інфармацыі, традыцыйна ствараецца Назіральны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі.

«Апошнія выбарчыя кампаніі ў «савет па інфармацыйных спрэчках» уваходзяць не толькі прадстаўнікі самых уплывовых СМІ і, перш за ўсё, Міністэрства інфармацыі, але і прадстаўнікі двух журналісцкіх саюзаў — дзяржаўнага і недзяржаўнага», — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

Сродкі масавай інфармацыі, прадстаўнікі якіх уваходзяць у Назіральны савет, не транслююць і не публікуюць выступленні кандыдатаў, прынамсі, бясплатна.

### Не больш за тысячу

Для фінансавання расходаў па перадвыбарнай агітацыі кандыдат мае права стварыць уласны выбарчы фонд. Пра гэта паведаміла **саветнік-кансультант аддзела арганізацыйнай, фінансавай работы і міжнароднага супрацоўніцтва апарату Цэнтральнай камісіі Валянціна ВАСІЛЕЎСКАЯ.**

Уласныя сродкі кандыдата ў гэтым выпадку не могуць перавышаць тысячы базавых велічынь — 25 500 рублёў, добраахвотныя ахвяраванні грамадзян — не больш за пяць базавых велічынь ад аднаго беларуса ў сукупнасці (127,5 рубля) і добраахвотныя ахвяраванні юрыдычных асоб — не больш за дзесяць базавых велічынь ад адной у сукупнасці (255 рублёў).

Агульная сума расходаў з выбарчага фонду не можа перавышаць тысячы базавых велічынь. Нязрасходаваныя сродкі выбарчага фонду пералічваюцца ахвяравальнікам не пазней 19 лістапада.

Падчас гэтай выбарчай кампаніі ўпершыню кандыдат можа атрымліваць інфармацыю аб стане рахунку праз інтэрнэт-банкінг Беларусбанка. У гэтай сістэме можна таксама і зрабіць ахвяраванне. Пры гэтым карыстанне інфакіёскамі не прадугледжана.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Узровень

## У МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ СКЛАЛІ РЭГІЯНАЛЬНЫ РЭЙТЫНГ

**Камітэт эканомікі Мінскага аблвыканкама склаў рэйтынг раёнаў рэгіёна па 23 паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця за першыя тры гады пяцігодкі і першае паўгоддзе 2019-га, паведамілі ў Мінаблвыканкаме.**

Сярод крытэрыяў ацэнкі — сярэдняя заработная плата, узровень зарэгістраванага беспрацоўя, міграцыйныя прырост або змяншэнне, запазычанасць у выручцы ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў або паслуг. «Дастаткова паглядзець, дзе людзі хочуць жыць, а дзе колькасць насельніцтва на працягу некалькіх гадоў пастаянна скарачаецца, каб адказаць на пытанне, якія рэгіёны з'яўляюцца прывабнымі, а якія знаходзяцца ў дэпрэсіўным стане», — пракаментавала **старшыня камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Таццяна БРАНЦЭВІЧ.**

У пяцёрку лідараў трапілі Смалявіцкі (першае месца за 2016—2018 гады і 9-е месца за першае паўгоддзе 2019-га), Дзяржынскі (другое і першае адпаведна), Мінскі (трэцяе), Салігорскі (чацвёртае і другое) раёны і горад Жодзіна (пятае). У буйных раёнах вобласці, такіх як Барысаўскі, Маладзечанскі і Салігорскі, распрацаваны планы паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Зыходзячы з аналізу, праведзенага камітэтам эканомікі, можна зрабіць выснову, што Салігорскі раён развіваецца паскоранымі тэмпамі. У ім па выніках першага паўгоддзя назіраецца станоўчая міграцыя насельніцтва і самая высокая заработная плата.

Барысаўскі і Маладзечанскі раёны займаюць апошнія месцы ў табліцы па міграцыйным руху насельніцтва, маючы не самыя высокія тэмпы росту рэальнай заработнай платы. Тым не менш Барысаўшчына некалькі палепшыла сваё рэйтынгавае становішча (12/10), а па ўзроўні прамысловай вытворчасці мае паказчык вышэй за сярэднеабласны. Маладзечанскі раён апусціўся ў рэйтынгу з 10-га месца на 17-е. Гэта звязана са зніжэннем аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ і невысокімі індэксамі вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі і рознічнага тавараабароту. Найбольш нізкія паказчыкі ў Вілейскага, Крупскага, Слуцкага, Капыльскага і Валожынскага раёнаў.

У цэлым эканамічны рост Мінскай вобласці сёлета ў першым паўгоддзі забяспечаны на ўзроўні 105,3 % (пры прагнозе 102,3 %). За сем месяцаў гэты паказчык склаў ужо 105,8 %.

**(Ул. інф.)**

Гучная справа

## «Гром сярод яснага неба»

**Марына Арзамасава часова адхіленая ад выступленняў**

**У допінг-спробе 31-гадовай лёгкаатлеткі выяўлена забароненае рэчыва LGD-4033 — адзін з селектыўных мадулятараў андрагенных рэцэптараў.**


Фота БелТА.

«Гэта гром сярод яснага неба. Мы нават не знаходзім слоў, каб растлумачыць, што адбываецца. Для Марыны і Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі — гэта вялікі шок, — пракаментаваў навіну **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.** — Наша федэрацыя нецярпімая да допінгу, і мы максімальна, наколькі можна, праводзім прафілактыку сярод спартсменаў. Што датычыцца спорту вышэйшых дасягненняў, сёння гэтай самадзейнасцю будзе займацца толькі самазабойца, улічваючы пільную ўвагу да беларускіх атлетаў з боку міжнародных арганізацый. Цяпер мы праходзім працэс аднаўлення даверу да нашых спартсменаў, і ён на самым высокім узроўні».

Нагадаем, Марына Арзамасава выйграла «золата» чэмпіянату свету ў Пекіне ў 2015 годзе ў бегу на 800 метраў, годам раней яна стала першай на чэмпіянаце Еўропы ў Цюрыху на гэтай жа дыстанцыі. Год таму спартсменка другі раз стала мамай і пасля гэтага не выступала на спаборніцтвах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Здарэнне

## ПРЫМАЙ ШПІЦА, МАЯ МАЛАДЗІЦА!

**51-гадовы мінчанін скраў чужога сабаку, каб падарыць на дзень нараджэння жонцы.**

Інцыдэнт адбыўся ў адным з раёнаў сталіцы. Жанчына, выгульваючы раніцай свайго памеранскага шпіца, вырашыла наведаць універсам. Паколькі з жывёламі заходзіць было нельга, гаспадыня пакінула сабаку на вуліцы. Мінчанка была ўпэўненая, што той нікуды не дзенецца, бо ён быў навучаны камандам і заўсёды спраўна іх выконваў.

Аднак сітуацыя разгарнулася зусім іншым чынам: сабака спадабаўся мужчыну, які спяшаўся на дзень нараджэння жонкі. Паколькі падарунак яшчэ не быў падрыхтаваны, а з пустымі рукамі на ўрачыстасць ісці не хацелася, ён прыхапіў шпіца. Схаваўшы сабаку пад куртку, фігурант аднёс яго дамоў да жонкі, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Выявіўшы прапажу шпіца, гаспадыня адразу звярнулася да праваахоўнікаў. Аператыўнікі, пераглядаючы запісы з камер відэаназірання, хутка высветлілі асобу выкрадальніка сабакі. Ім аказаўся 51-гадовы жыхар Фрунзенскага раёна. Выкрадзенага шпіца праваахоўнікі знайшлі ў кватэры жонкі зламысніка і вярнулі законнай уладальніцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Памяць

# АДНА НА ЎСІХ...

**У першыя дні вайны беларусы збівалі нямецкія самалёты над Малдовай**

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў вечар памяці «Адна на ўсіх Перамога», прымеркаваны да 75-годдзя вызвалення Рэспублікі Малдова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Малдова была акупавана летам 1941 года, і толькі ў канцы жніўня 1944 года ў выніку Яска-Кішынёўскай аперацыі (дарэчы, прызнанай адной з найлепшых у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны) стала свабоднай ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У баях за яе вызваленне адзначыліся і беларусы. Падчас гэтай жнівеньскай аперацыі былі разгромлены 22 нямецкія дывізіі, у тым ліку 18 аказаліся ў акружэнні. Унёсак беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі быў высока ацэнены — 15 чалавек атрымалі званне Герояў Савецкага Саюза, чацвёра пасмяротна, сотні ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі за паспяховае выкананне баявых задач па авалоданні населенымі пунктамі, шэраг часцей і злучэнняў, якімі камандавалі беларусы, атрымалі ганаровыя найменні, а асабоваму складу была аб'яўлена падзяка.

Як паведаміў **кандыдат гістарычных навук Барыс ДАЛГАТОВІЧ,** ужо ў першыя гадзіны вайны лётчыкі-беларусы ў Малдове збівалі нямецкія самалёты, сярод іх быў і сяржант Іван Іванавіч Пстыга (пазней ён стане маршалам авіяцыі), адзіны чалавек у Савецкай Арміі, які меў 8 ордэнаў Чырвонага Сцяга.

— Беларусы адзначыліся на ўсіх этапах вызвалення Малдовы, — падкрэсліў **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Анатоль КРЫВАРОТ** і прывёў красамоўныя прыклады: самааддана дзейнічаў у баях па вызваленні Малдовы танкавы батальён пад камандаваннем капітана Катлаўца. 13 красавіка 1944 падраздзяленне фарсіравала Днестр і захапіла плацдарм на заходнім беразе, пры гэтым сам камандзір-беларус асабіста знішчыў чатыры танкі і дзве самаходныя ўстаноўкі. У гонар Героя Савецкага Саюза Катлаўца названы вуліцы ў Кішынёве, Цірасполі і Мазыры. Паспяховаму наступленню войскаў у многім садзейнічалі зладжаныя дзеянні сапёрных падраздзяленняў, якія змаглі пад агнём праціўніка ў самыя кароткія тэрміны ўзвесці паромныя пераправы і масты цераз рэкі. Адным з такіх батальёнаў камандаваў беларус капітан Высокагорац. За ўмелае кіраўніцтва падначаленымі пры ўзвядзенні інжынерных збудаванняў і асабістую мужнасць ён уганараваны званнем Героя Савецкага Саюза...

Адным з непасрэдных распрацоўшчыкаў плана па канчатковым вызваленні Малдовы з'яўляўся ўраджэнец Гродна, начальнік аператыўнага ўпраўлення штаба II Украінскага фронту генерал-маёр Паўлоўскі. Многія камандзіры-беларусы праявілі сябе падчас гэтай аперацыі, можна ўспомніць дзясяткі прозвішчаў...

А малдаване змагаліся за вызваленне Беларусі. Адзін з прыкладаў, што праводзіць пасольства Рэспублікі Малдова, — увекавечанне памяці малдаван, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі. «Я аб'ехаў усе магілы — іх 49, — дзе пахаваны 80 малдаўскіх воінаў, — падзяліўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Рэспубліцы Беларусь Віктар Сарачан. — На магілах быў зроблены забор зямлі і створаны дзве капсулы з прахам. Адна перапраўлена ў Малдову і ўсталяваная ў адным з гістарычных месцаў, а другая будзе размешчана ў крыпце храма Усіх Святых 9 мая. Яшчэ адзін сумесны праект, які плануецца завяршыць да 75-годдзя Перамогі, — устаноўка ў Мінску помніка-бюста Герою Савецкага Саюза малдаваніну Іону Солтысу, які сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Супрацоўніцтва

## ІНВЕСТЫЦЫІ З КІТАЯ ВЫРАСЛІ Ў СОТНІ РАЗОЎ

**Прамыя замежныя інвестыцыі з гэтай краіны за апошнія дзесяць гадоў выраслі ў 200 разоў. Кітай заняў трэцяе месца ў ліку нашых гандлёва-эканамічных партнёраў, адзначыла ўчора намеснік міністра эканомікі Беларусі Алена Пярмінава пасля цырымоніі завяршэння будаўніцтва першага жылога дома ў індустрыяльным парку «Вялікі камень».**

Партфель тэхніка-эканамічнай дапамогі Кітая на сёння складае ўжо паўмільярда долараў і, па словах намесніка міністра, будзе расці. У прыватнасці, толькі з 2015 года ў рамках 12 праектаў Кітай выдзеліў нашай краіне амаль на 185 мільёнаў долараў тэхніка-эканамічнай дапамогі. «Ключавымі праектамі з'яўляюцца развіццё індустрыяльнага парку «Вялікі камень», будаўніцтва сацыяльнага жылля, студэнцкага інтэрната ў Мінску, а таксама тэрапеўтычнага корпуса Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы».

Кітайскія інвестыцыі накіраваны на будаўніцтва першай чаргі сістэмы электрыфікацыі індустрыяльнага парка і на рэканструкцыю рэчышча ракі Уша. Індустрыяльны парк першым у нашай краіне атрымаў міжнародны сертыфікат экалагічнага менеджменту і аўдыту, мае статус экагорада, у ім гарманічна спалучаюцца вытворчая, адміністрацыйная і жылая інфраструктуры. Для прыцягнення замежных інвестараў на тэрыторыі «Вялікага каменя» створаны лепшыя ўмовы для развіцця інавацыйных і экспартаарыентаваных вытворчасцяў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Брытанскі ўрад прыпыніць работу парламента



Урад Вялікабрытаніі плануе прыпыніць работу парламента да 14 кастрычніка (за два тыдні да меркаванага выхаду краіны са складу ЕС без здзелкі). Пра тое, што кабінет прэм'ера Барыса Джонсана звернецца да каралевы з такой просьбай, паведамілі брытанскія СМІ. Пасля ўжо і сам прэм'ер пацвердзіў, што перапынак у рабоце парламента плануецца пасля дэбатаў 9 верасня. Барыс Джонсан назваў «абсалютнай няпраўдай» паведамленні пра спробы пазбавіць парламент уплыву ў пытаннях «брэксіту». Паводле яго слоў, адтэрміноўка пасяджэнняў неабходная для прапрацоўкі новай заканадаўчай праграмы па пытаннях барацьбы са злачыннасцю, у сферах аховы здароўя і адукацыі. На думку назіральнікаў, калі прыпыненне дзейнасці парламента адбудзецца, то прадстаўнікі апазіцыйных партый не змогуць перашкодзіць «брэксіту» без здзелкі, паколькі не паспеюць прыняць для гэтага адпаведныя законы, таму што вернуцца з канікулаў 3 верасня. Але Джонсан сцвярджае, што ў парламентарыяў будзе дастаткова часу, каб абмеркаваць адпаведныя пытанні да і пасля саміту ЕС 17 кастрычніка. Пры гэтым днямі прадстаўнікі апазіцыйных партый і незалежныя дэпутаты дамовіліся сумесна працаваць над тым, каб не дапусціць выхаду Вялікабрытаніі з Еўрасаюза без пагаднення з Брусэлем. Пра гэта гаворыцца ў сумеснай заяве, распаўсюджанай напярэдадні па выніках сустрэчы, якая адбылася па ініцыятыве лідара апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі Джэрэмі Корбіна.

### Каля берагоў Лівіі затанула судна з мігрантамі



Па меншай меры 40 чалавек загінула і прапала без вестак каля берагоў Лівіі ў выніку крушэння судна з нелегальнымі мігрантамі, якія накіроўваліся ў Еўропу. Больш за 60 чалавек было выратавана і вернута на бераг. Па словах прадстаўнікоў лівійскай берагавой аховы, целы пяці мігрантаў, у тым ліку дзяцей, былі выяўленыя і вынятыя з вады. Як адзначыў афіцыйны прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН) Чарлі Якслі, назіраецца «неверагодна трывожны рост колькасці людзей, якія гінулі пры перасячэнні мяжы паміж Лівіяй і Еўропай. Зараз сітуацыя такая: з шасці-сямі чалавек, якія адпраўляюцца па такім маршруце да еўрапейскіх берагоў, адзін — гіне... Існуе сапраўдны крызіс смерці». Па словах афіцыйнага прадстаўніка Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, нельга дапускаць захавання такой сітуацыі. Падрабязнасці трагічнага здарэння каля лівійскіх берагоў пакуль да канца не высветлены. У раён караблекрушэння прыбылі ратавальнікі, яны праводзяць гутаркі з выжылымі, каб дэталёва высвятліць усе абставіны інцыдэнту.

### У Францыі нейтралізавалі вірус, які падпарадкаваў сабе 850 тысяч камп'ютараў



Спецыяльны цэнтр французскай жандармерыі па барацьбе з кіберзлачыннасцю (C3N) здолеў нейтралізаваць вірус, які на працягу доўгага часу выкарыстоўвала ў сваіх мэтах буйная сетка хакераў. Пра гэта паведаміла газета Le Figaro. Паводле яе інфармацыі, у ходзе праціўдзеяння кіберзлачынцам жандарам удалося абясшкодзіць задзейнічаныя ў іх атаках больш чым 850 тысяч камп'ютараў. Яны належалі карыстальнікам, якія нават нічога не ведалі пра тое, што іх абсталяванне знаходзіцца пад дыстанцыйным кантролем хакераў. Па звестках жандармерыі, гэтая злачынная супольнасць дзейнічала ў сусветным сеціве не менш за тры гады. Аперацыі праваахоўных органаў папярэднічалі доўгія і ўсёабдымныя выведвальныя дзеянні. Эксперты жандармерыі высветлілі, што напады праводзіліся з сервера, размешчанага ў парыжскім раёне. У ходзе завяршальнай фазы аперацыі спецыялістамі быў знішчаны «чарвяк» — шкодная праграма, якая дазваляла хакерам пранікаць нават у дзяржаўныя сайты.

# ШКОЛЫ ГАТОВЫ! А ВЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб адчуць, чым вылучаецца сённяшняя школа-навабудоўля, дастаткова зазірнуць у адну з іх. Напрыклад, у новай школе № 93, будаўніцтва якой пачалося ў 2018-м, ёсць не толькі вучэбныя кабінеты і лабараторыі, памяшканні для працоўнага навучання, вучэбна-спартыўныя залы з раздзявальнямі, але і цір, лыжная база, памяшканні для медыцынскага абслугоўвання, інфармацыйна-тэхнічны цэнтр, агульнашкольны цэнтр з актавай залай і пакоем грамадскіх арганізацый, лекцыйныя залы, памяшканні для эстэтычнага выхавання і гуртковай работы і іншае. Тут створана безбар'ернае асяроддзе для адукацыйнага працэсу дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця: прадугледжаны ліфт, пандус, спецыяльныя месцы ў актавай зале, вучэбных кабінетах, асобныя раздзявальні, санвузлы, душавыя. Прадумана і зручнае размяшчэнне памяшканняў і кабінетаў. На падвальным узроўні знаходзяцца гардэробныя боксы для II—XI класаў, памяшканні вучэбнага 25-метровага ціра, разлічаныя на чатыры стралковыя месцы,а таксама тэхнічныя і інжынерныя памяшканні. На першым паверсе — вестыбюль, сталовая, разлічаная на 340 пасадачных месцаў, вітамінны бар на восем пасадачных месцаў, бібліятэка з чытальнай залай і кнігасховішчам, лыжная база і майстэрні па апрацоўцы тканіны, драўніны, металу. У другім блоку першага паверха размясціліся раздзявальні, вучэбныя класы, спальні і гульнявыя для першакласнікаў.

**Сёлета ў Беларусі дзейнічае 2 951 установа дашкольнай адукацыі, 3003 — агульнай сярэдняй, а таксама 127 прафесійных каледжаў і ліцэяў і 111 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Студэнты вучацца ў 42 дзяржаўных і 9 прыватных ВНУ.**

На другім паверсе школы знаходзяцца актавая зала з эстрадай, а таксама артыстычным, касцюмерным і інвентарным пакоямі і санвузлом, акрамя гэтага, спартыўная, гімнастычная і трэнажорная залы з раздзявальнямі, вучэбныя кабінеты і медыцынскі блок, адміністрацыйныя і рэсурсныя цэнтры, бытавыя памяшканні. На трэцім паверсе размяшчаюцца кінапраекцыйная, гукаапаратная, радыёвузел, канферэнц-зала на 80 месцаў, хол-балкон спартыўнай залы з трыбунамі для гледачоў, зал харэаграфіі і рытмікі з раздзявальнямі, пакой інструктараў, вучэбныя класы, лабараторыі, інфармацыйна-выставачнае памяшканне, памяшканне для індывідуальных і групавых заняткаў, рэсурсныя цэнтры і настаўніцкія. На чацвёртым паверсе — вучэбныя класы і кабінеты, лабараторыі, два кабінеты інфарматыкі, чатыры лінгафонныя кабінеты, канферэнц-зала на 100 месцаў.




Фота БелТА.

**У Брэсце рыхтуецца да адкрыцця вучэбна-педагагічны комплекс «Яслі-сад — пачатковая школа» № 11. Пасля здачы ў эксплуатацыю ВПК зможа прыняць 150 дзяцей для дашкольнай адукацыі і 300 навучэнцаў пачатковых класаў. Для выхаванцаў абсталявалі ёмістую спартзалу, басейн, сэнсарны пакой, актавую і музычную залы.**

У сталічнай сярэдняй школе № 2 будзе 44 класы. Тут таксама, акрамя вучэбных кабінетаў і лабараторый, будуць цір і лыжная база, а яшчэ басейн, інфармацыйна-тэхнічны цэнтр і агульнашкольны цэнтр з актавай залай і іншае. Тут таксама створана безбар'ернае асяроддзе для дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

## Колькасць вучняў расце

Сёлета ў Беларусі 2 верасня ўрокі пачнуцца ў 3003 школах. За парты сядзе больш за 1 мільён 30 тысяч вучняў, з іх 115 тысяч — першакласнікі. Дарэчы, летась першакласнікаў было крыху больш за 110 тысяч.

— На працягу шэрагу апошніх гадоў колькасць вучняў у школах павялічваецца, у тым ліку і першакласнікаў, — адзначае Ірына Каржова.

З пачатку навучальнага года да работы ў школах прыступілі больш за 4 300 маладых спецыялістаў. Усяго ў школах сёлета будзе працаваць 90 тысяч настаўнікаў.

Амаль усе школы ўжо атрымалі пашпарты гатоўнасці.

— Мясцовыя выканаўчыя ўлады правялі мерапрыемствы па прыёмцы школ да новага навучальнага года. Гэта не фармальная працэдура: ствараліся камісіі, куды, акрамя спецыялістаў сістэмы адукацыі, уваходзілі супрацоўнікі МНС і санітарна-эпідэміялагічнай службы, — падкрэсліла Ірына Каржова. — Правяралася не толькі завяршэнне рамонтных работ, але і стварэнне бяспечных умоў для арганізацыі адукацыйнага працэсу.

## Што мяняецца ў праграмах?

У гэтым навучальным годзе завершыцца пераход на новыя навучальныя праграмы на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі, які пачаўся ў 2015 годзе. Яны ўводзяцца ў 9 класе. Такім чынам, сёлета ўсе вучні з 1 да 9 класа будуць навучацца па абноўленых праграмах. Канчатковы пераход на новыя вучэбныя праграмы адбудзецца ў 2021—2022 гадах.

— Асноўная задача абнаўлення вучэбных праграм — разгрузіць вучняў, прывесці праграмы ў адпаведнасць з узроставымі пазнавальнымі здольнасцямі дзяцей, — тлумачыць **намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Людміла РАМАНОЎСКАЯ**. — Напрыклад, раней трыганаметрыю вывучалі ў 8—9 класах. Але для васьмікласнікаў гэта было складана, таму цяпер яе вывучаюць толькі дзевяцікласнікі. Твор Мікалая Гогаля «Мёртвыя душы» перанесены з праграмы 9 класа ў праграму 10 класа. А твор «А досвіткі тут ціхія» Барыса Васільева цяпер чытаюць у 9 класе. Таксама скарочана колькасць тэрмінаў і паняццяў, абавязковых для засваення. Мы знаходзімся на пастаяннай сувязі з настаўнікамі-практыкамі. Напрыклад, многія скардзіліся, што праграма 7 класа па біялогіі перанасычана лабараторнымі і практычнымі работамі. Мы прааналізавалі і пагадзіліся — цяпер частка работ перанесена ў разрад дэманстрацыйных вопытаў. Гэтак жа мы прыслухаліся да педагогаў з праграмай па геаграфіі 8 класа. У выніку зменшылі колькасць выканаўчых практычных работ.

З гэтага года ў вучняў 6—8 класаў знікне прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», яго будуць вывучаць толькі ў 2—5 класах.

— Гэта дазволіць знізіць вучэбную нагрузку ў 6—8 класах. А вывучаць бяспеку жыццядзейнасці вучні змогуць на пазакласных і факультатыўных занятках, некаторыя раздзелы гэтага прадмета ўключаны ў вучэбныя праграмы па іншых прадметах, — растлумачыла Ірына Каржова.

Людміла Раманоўская падкрэсліла, што разам з праграмамі мяняюцца і школьныя падручнікі.

— Вучэбныя дапаможнікі найчасцей крытыкуюць за складаныя навукаёмістыя тэксты і недастатковую колькасць ілюстрацый. Асноўнае наша патрабаванне — каб змест быў даступны. Аж да таго, каб колькасць тэрмінаў і слоў у сказе не перавышала пэўную лічбу. Падручнікі павінны быць лёгкія, маляўнічыя, цікавыя. Просім складальнікаў прадстаўляць інфармацыю не толькі тэкставую, але і ў выглядзе табліц, схем, дыяграм. Змест павінен быць максімальна практыкаарыентаваным. Усе падручнікі распрацоўваюцца на конкурснай аснове.

Сёлета падрыхтаваны 51 новы вучэбны дапаможнік. Найбольшую іх колькасць атрымаюць дзевяцікласнікі ў сувязі з абнаўленнем вучэбных праграм. Паводле слоў Людмілы Раманоўскай, усе яны гатовы і завозяцца ў школы.

— Сёлета працягнецца работа па стварэнні аднолькавых умоў для ўсіх вучняў — школ і гімназій, сельскіх і гарадскіх школ. На другой ступені навучання ў 8 і 9 класах прадугледжана магчымасць паглыбленага вывучэння прадметаў, — адзначыла Ірына Каржова.

Таксама працягнецца рэалізацыя профільнай адукацыі ў 10—11 класах. Гэта класы педагагічнай, аграрнай, ваенна-патрыятычнай накіраванасці, сёлета адкрыюцца спартыўна-педагагічныя класы. Арганізавана і прафесійная падрыхтоўка вучняў 10—11 класаў, якія вывучаюць усе прадметы на базавым узроўні. Летась яна была даступная для 21 тысячы дзесяцікласнікаў, сёлета прафесію будуць атрымліваць 42 тысячы вучняў 10 і 11 класаў.

— У зацверджаным пераліку — каля 100 прафесій. Яны вызначаліся з улікам рэальных магчымасцяў навучальнай установы, запыту вучняў і запатрабаванасці на рынку працы, — расказвае Ірына Каржова.

**«Твор Мікалая Гогаля «Мёртвыя душы» перанесены з праграмы 9 класа ў праграму 10 класа. А твор «А досвіткі тут ціхія» Барыса Васільева цяпер чытаюць у 9 класе».**

Працягнецца сёлета аснашчэнне сучасным абсталяваннем кабінетаў хіміі і біялогіі. У школы паставяць адну тысячу інтэрактыўных сэнсарных сістэм.

— Гэта дазволіць павысіць якасць адукацыі ў рэалізацыі практычнай часткі вучэбных праграм. Цэнтралізаваная пастаўка сучасных сістэм і абсталявання пачалася ў 2013 годзе. І да 2018-га было аснашчана 612 кабінетаў фізікі і 366 кабінетаў хіміі. З 2019 года мы пачалі аснашчаць кабінеты біялогіі.

Сёлета 2 верасня першы ўрок ва ўсіх школах Беларусі пройдзе пад назвай «Занімай, Беларусь маладая, свой пачэсны пасад між народамі!», —словы ўзяты з твора Янкі Купалы. А ўсе першакласнікі па традыцыі атрымаюць падарунак ад Прэзідэнта краіны — абноўленае маляўнічае выданне «Беларусь — наша Радзіма».

**Алена КРАВЕЦ.**

# ВЫХАДНЫЯ З ДЗІЦЯЧАЙ ЧЫГУНКАЙ

**1 верасня з 12.00 да 13.00 на станцыі Заслонава Дзіцячай чыгункі наведвальнікі змогуць паглядзець канцэрт, падрыхтаваны калектывамі культурна-спартыўнага цэнтра мінскага аддзялення БЧ «Заўтра ў школу».**

У праграме — выступленне ўзорнага ансамбля танца «Цягнічок», вакальнага ансамбля «Зорачкі», заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля эстраднага танца «Гарэзныя агеньчыкі», паведамілі ў прэс-цэнтры БЧ.

Акрамя таго, 1 верасня з 11.00 да 16.40 па Дзіцячай чыгунцы будзе курсіраваць цягнік «Сталічны экспрэс». Ён традыцыйна правязе пасажыраў па маршруце ад станцыі Заслонава праз станцыю Піянерская да станцыі Сасновы Бор і назад.

Працягне сваю работу Дзіцячая чыгунка і ў верасні. Рух цягнікоў будзе арганізаваны па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40. Завершыцца 64-ы сезон 22 верасня.

У кастрычніку пачнуцца заняткі ў гуртку «Юны чыгуначнік». Хлопцы і дзяўчаты будуць асвойваць асноўныя чыгуначныя дысцыпліны: «Агульны курс чыгунак», «Вагонная гаспадарка», «Лакаматыўная гаспадарка», «Пуцявая гаспадарка», «Арганізацыя пасажырскіх перавозак».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


РЕЗУЛЬТАТ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«ОКТОБЕРФЕСТ И УДИВИТЕЛЬНАЯ ПРАГА»**



**Организатор рекламной игры:** общество с ограниченной ответственностью «Раковский Бровар». Юридический адрес: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Витебская, д. 10, каб. 3, УНП 101287377, свидетельство о государственной регистрации от 8 ноября 2000 г. № 1266.

**Название рекламной игры** «Октоберфест и удивительная Прага».

**Срок проведения рекламной игры –** с 10.06.2019 г. по 02.09.2019 г., включая период розыгрыша и вручения приза.

**Территория проведения рекламной игры –** ресторан «Раковский Бровар» по адресу: г. Минск, ул. Витебская, д.10.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3568 от 3 июня 2019 г. выдано Министерством Антимонопольного Регулирования и Торговли Республики Беларусь.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Октоберфест и удивительная Прага».

| № | ФИО | Населенный пункт |
|---|---|---|
| | Приз – тур на двоих на «Октоберфест и удивительную Прагу» | |
| 1 | Большакова Наталия Михайловна | г. Минск |

В розыгрыше Приза приняли участие все регистрационные анкеты, заполненные участниками в период с 10 июня 2019 г. по 20 августа 2019 г. в соответствии с п.8 Правил проведения рекламной игры. Все анкеты были помещены в лототрон, перемешаны. Обладатель приза был выбран случайным образом путем извлечения приглашенным посторонним лицом из Лототрона Регистрационной анкеты участника рекламной игры в присутствии членов комиссии. Члены комиссии составили протокол проведения розыгрыша рекламной игры и подтвердили, что нарушений порядка проведения розыгрыша отмечено не было.

**Телефон по вопросам проведения рекламной игры +375 44 7339339**

Сямейная газета

Выпуск № 14 (129)

## ТЫ — МНЕ, Я — ТАБЕ. А ІМ?..

*На гендарна-сямейных франтах чарговыя баі, звязаныя з патэнцыйным навоўвядзеннем у Кодэкс аб шлюбе і сям'і — у інтэрнэце стварылі петыцыю, аўтары якой прапануюць абавязаць атрымальнікаў аліментаў даваць справаздачу, на што канкрэтна былі патрачаны грошы. Адрасавання прапанова Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, падпісалі яе, праўда, пакуль толькі 64 чалавекі, а аўтар... здагадайцеся, хто? Сядайце, мама з трыма дзецьмі, правільна: мужчына.*

*Хоць чаму — правільна? Няправільна гэта, няладна. І рэч не ў пасыле — устанавіць абмежаванне памеру наяўных выплат аліментаў, а ўсю астатнюю суму пералічваць на рахунак і мець магчымасць кантраляваць, каб яна выдаткоўвалася менавіта на інтарэсы дзіцяці. Справа ў тым, што ролю людзей, якія перасталі быць мужам і жонкай, але засталіся бацькамі СВАІМ дзецям, вымяраюць найперш грашыма. Хто больш заплаціў, той і маладзец. А дзеці — памятаеце савецкі фільм-казку пра Пітэра Пэна і бліскучы песенны дыялог мамы і таты (дзякуй геніяльнаму паэту Леаніду Дзербянёву) — гэта не толькі кветкі, уцеха і вясновага сонца промні, але і «расстройства страўніка, вятранка, краснуха і запаленне сярэдняга вуха», новыя адзенне і абутак, якія падабаюцца табе, але не падабаюцца дзецям, бясконцыя «хачу» і «не хачу», «дапамажы» і «я сам», лекі, паліклінікі, урокі, секцыі і гурткі, паступленне, перажыванні, бясконцыя крызісы ўзросту... Пералічваць можна доўга, на ўсе літары алфавіту, але галоўнай будзе «А». Дзеці — гэта адказнасць з моманту нават не нараджэння, а зачацця, а яшчэ лепш планавання.*

*І таму вельмі дзіўна, калі гэту адказнасць бацькі з усіх сіл стараюцца дэлегаваць, а працяй кажучы, спіхнуць на кагосьці іншага: выхоўвае няхай школа, займае летнія канікулы — бабуля, загартоўвае і мацуе — трэнер у спартыўнай секцыі, вядзе прафілактыку хвароб — педыятр у паліклініцы. А я грошай заплачу, колькі там трэба, і ўбаку пастаю, палюбуюся, як дзіця расце.*

*Але гэта так не працуе — ні ў поўных сем'ях, ні, тым больш, у сем'ях, якія распаліся. Калі ад дзіцяці толькі адкупляцца грашыма альбо маніпуляваць адказнасцю за яго, усяляк перабольшваючы свой унёсак і прымяншаючы ролю «былога(ой)», рана ці позна падрослае дзіця гэта зразумее. Вам што больш даспадобы: каб нашчадкі глядзелі на вас як на кашалёк альбо ціха ненавідзелі за раўнадушна і недададзеную любоў? Пакуль былыя бацькі матляюць адно аднаму нервы, то забараняючы дзецям выезд за мяжу, то патрабуючы да капейчыны справаздачу, на што патрачаны аліменты (у інтэрнэце яны ва ўсіх астранамічна вялікія, у рэальнасці аказваюцца сярэднестатыстычныя і досыць часта спаганяюцца ў судовым парадку, бо добраахвотна бацькі выплачваць грошы на ўтрыманне дзіця не спяшаюцца), дзецям патрэбны не толькі і не столькі матэрыяльны дабрабыт, колькі паўсядзённы клопат і ўвага.*

*Усё зразумела, скажаце вы, зараз аўтар уключыць старую шарманку пра тое, што ў разведзеных сем'ях усе маці гераіні, а таты здраднікі, хоць у жыцці нярэдка бывае наадварот і нямала жанчын жывуць прыпяваючы на бацькавы аліменты і не працуюць, а мужчыны ваююць за правa пакінуць дзяцей сабе... А вось і не, я стараюся ўтрымацца ад пазіцыі абаронцы ці абвінавачвальніка. Бо кожны выпадак — індывідуальны, кожная нешчаслівая сям'я, паводле Льва Мікалаевіча Талстога, няшчасная па-свойму, і мераць усіх на адзін капыл як мінімум некарэктна. Магчыма, я ідэаліст, аднак вельмі хочацца, каб дарослыя людзі ўсё ж навучыліся не толькі ваяваць, але і дамаўляцца. Давайце паспрабуем не лічыць грошы ў кішэні былога, не дзяліць на «вы» і «мы», бо гэтая спрэчка не скончыцца ніколі, і не прыводзіць гіпатэтычных прыкладаў далёкіх сваякоў і знаёмых, а адказваць кожны за сябе, за свае ўчынкі і за сваіх дзяцей. На мове закону Кодэкс аб шлюбе і сям'і падае гэта так: «Абавязак бацькі і маці па ўтрыманні непаўналетніх дзяцей з'яўляецца роўным і безумоўным». Або, калі хочаце, лірыкай: усё найлепшае — аддавайце дзецям. Бо калі не мы, то хто?..*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

Святлана БАРОЎСКАЯ:

# «Пакуль жывыя нашы бацькі, мы — дзеці»



Кацярына і Святлана БАРОЎСКІЯ.

**«Божа, гэта голас з майго дзяцінства, з тэлевізара», — так адрэагаваў 20-гадовы барыста, прымаючы заказ ад Святланы Бароўскай. Мы сядзелі на ўтульнай верандзе невялікага сталічнага кафэ на вуліцы Румянцава. За дзве гадзіны некалькі чалавек павіталіся з маёй суразмоўніцай. Ад сяброўскага: «Светачка, дарагая, сто гадоў не бачыліся!» да паважнага: «Добры дзень, Святлана Аляксееўна!» — ад студэнтаў журфака, дзе яна з нядаўняга часу выкладае. А яшчэ запомніўся сталы мужчына. Ён сказаў, што як толькі жонка пачынае скардзіцца на надвор'е ці здароўе, ён ёй кажа: «Паглядзі на тую даму з тэлевізара». І гэта аказваецца найлепшым рэцэптам супраць маркоты. Бароўская — не першая знакамітасць, з якой мы апынуліся ў публічным месцы, але такога бенефісу не згадаю.**

Мы дамовіліся пагутарыць аб адносінах дзяцей і бацькоў. Таму спачатку было інтэрв'ю са Святланай, а потым я сустрэлася з яе мамай — Кацярынай Дзмітрыеўнай, і задала ёй такія ж пытанні.

***— Першае дзіця ў вас з'явілася ў вельмі маладым узросце, другое — праз 8-9 гадоў. Не было крыўдна, што сяброўкі на танцах, а вы дома з дзіцем на руках?***

**Кацярына Дзмітрыеўна:** — Абсалютна ні пра што не шкадую. Хоць планы ў мяне былі паступіць у тэатральны інстытут, аднак зрэзалася на трэцім туры творчага конкурсу. Былі тады ў Мінску пры тэатры Янкі Купалы вячэрнія курсы — пачала там займацца, але ўжо мела адносіны з будучым мужам, неўзабаве і вяселле згулялі. Які ж малады пацерпіць, каб жонка па вечарах прападала? А потым Святлана нарадзілася.

Я лічу, што мае дзеці з'явіліся на свет у самы ўдалы час. Дзеці — не перашкода ні ў кар'еры, ні ў адпачынку. Калі кажуць, што дзеці чамусьці там перашкодзілі ў жыцці, думаю, так прыкрываюць сваю ўласную ляноту. А такая розніца ва ўзросце дочак для мяне як для мамы вельмі зручная, таму што Святлана ўжо дапамагала няньчыць Руслану.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

На даверы

# РОДЫ ПА ПЛАНЕ: ВАС ЧУЮЦЬ



**«План родаў» існуе ў Беларусі ўжо некалькі гадоў. Ён уяўляе сабой пісьмовую заяву аб уліку правоў і інтарэсаў жанчыны ў правядзенні родаў: дзе, з кім і як яна хоча нараджаць. Напрыклад, жанчына можа выбраць партнёрскія роды ці роды без суправаджальніка, згадзіцца ці адмовіцца ад прымянення стымулюючых або абязбольваючых медыкаментаў, пасля родаў увесь час знаходзіцца з дзіцем ці не. Пры гэтым спецыялісты ініцыятывы «Тваё права на пазітыўны досвед у родах» (http://planrodov.radziny.by/)падкрэсліваюць, што «план родаў» — не ідэальны варыянт развіцця падзей і не алгарытм, а магчымасць дыялогу з памочнікамі ў родах, медыцынскімі работнікамі аб сваіх пажаданнях, ведах і поглядах на роды. Што мяняе наяўнасць «плану родаў» (і што трэба мяняць у сістэме рададапамогі), расказалі нашы суразмоўніцы: мама двух дзяцей і акушэрка з 36-гадовым стажам.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

## Пенсіі бываюць розныя

***?** У чым розніца паміж працоўнай пенсіяй і пенсіяй па ўзросце? Я прачытала, што ў жніўні яны павысіліся, але не разумею, хто з беларусаў можа атрымліваць першую і хто — другую.*
*(Н. І. Старасценка, г. Мінск)*

**На пытанне адказвае начальнік упраўлення рэгулявання пенсійных адносін галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Алена ГОМАРАВА:**

— У нас у краіне ў адпаведнасці з заканадаўствам прадугледжаны два віды пенсій: працоўныя і сацыяльныя. Калі тлумачыць спрошчана, працоўныя — гэта пенсіі за стаж працы з выплатай узносаў. Сацыяльныя пенсіі прызначаюцца пры недастатковасці або адсутнасці такога стажу.

У сваю чаргу, працоўныя пенсіі маюць некалькі падвідаў. Так, у іх лік уваходзяць пенсія па ўзросце, пенсія па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля, за выслугу гадоў і за асаблівыя заслугі перад рэспублікай. Значыць, пенсія па ўзросце адносіцца да працоўных пенсій.

Калі кажуць, што павышаюцца працоўныя пенсіі і пенсіі па ўзросце, то маецца на ўвазе, што павысяцца ўсе падвіды пенсій, якія ўваходзяць у панятак «працоўныя пенсіі». Панятак «працоўныя пенсіі па ўзросце» пры гэтым можа дадаткова выдзяляцца спецыялістамі, бо гэты від пенсій мае самую вялікую колькасць атрымальнікаў — 82 працэнты ад агульнай колькасці ўсіх пенсіянераў.

●ДАРЭЧЫ

### Крытэрыі патрэбы ў сацпаслугах плануюць змяніць

**Цяпер у нашай краіне распрацоўваецца новая мадэль вызначэння патрэбы грамадзян у сацыяльных паслугах.**

Пра гэта сказала на адной з прэс-канферэнцый **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА.**

«Цяпер ужываецца медыцынская мадэль вызначэння патрэбы. Але нам неабходна больш тонка вызначаць магчымасці чалавека: якія пытанні ён можа вырашаць самастойна, якія — з дапамогай сваіх родных. І індывідуальна вызначаць яго патрэбу ў сацпаслугах. Таму мы цяпер займаемся распрацоўкай сацыяльных паказанняў да аказання сацпаслуг. Ужо распрацаваны праект канцэпцыі выяўлення патрэбы грамадзян у сацыяльных паслугах», — заявіла Таццяна Фёдарава.

**Святлана БУСЬКО.**

# РОДЫ ПА ПЛАНЕ: ВАС ЧУЮЦЬ

Мама дзвюх дачок:

## «Не трэба баяцца пісьмова заяўляць пра свае пажаданні»

Брастаўчанка Ася Новаслабодская — мама дзвюх дачок. Старэйшую, якой хутка споўніцца восем, яна нарадзіла без «плана родаў».

— Я спадзявалася, што ў радзільні траплю ў надзейныя рукі медперсаналу, дзе мне ўсё падкажуць, была гатова слухаць і слухацца. Але ўсё атрымалася не зусім так, — згадвае Ася. — Я сама нічога не пытала, а мне ніхто нічога і не тлумачыў. У радзільню мяне палажылі загадзя, і калі мне здалося, што ўсё пачалося, я пайшла да ўрача. Яна паглядзела мяне на крэсле і... разрэзала калаплодны пузыр, нават не папярэдзіўшы мяне. Роды цягнуліся з 12 гадзін ночы да 10 раніцы. Акрамя мяне, у гэты час ніхто не нараджаў, але ніякай асаблівай увагі да мяне не было. Я імкнулася правільна дыхаць, не крычаць лішні раз — была ўзорна-паказальнай парадзіхай. Адну за другой прынесілі таблеткі, а на маё пытанне адказалі, што гэта глюкоза. Пасля з размовы медперсаналу я зразумела, што мне далі восем стымулюючых таблетак. Чаму ад мяне гэта хавалі? Было незразумела і крыўдна. У радзільнай зале пачалі цісну ць на жывот, імкнучыся, каб выйшла дзіця. І сказалі: калі не народзіш зараз — разрэжам. Я імкнулася запярэчыць: не трэба рэзаць. Адказалі, што ў мяне ніхто і не пытае. Гэтыя словы былі як халодны душ! Я проста захлынулася ад крыўды. Зразумела, што рабіць усё правільна ў такой абстаноўцы я не магу.

**«Партнёрскія роды павінны быць даступныя не толькі тым, хто можа заплаціць, — іх варта было б зрабіць бясплатнымі для ўсіх ахвотных».**

У выніку ўрачы прывялі сваю пагрозу ў дзеянне, а жанчына атрымала не самы лепшы досвед першых родаў.

— Я настройвалася даверацца, а ў выніку ўдарылася аб халодную рэчаіснасць. Я разумею, што ўрачы імкнуцца, каб нарадзілася здаровае дзіця і ўсё адбывалася хутка. А ў цябе ўсё заквыве. Падрыхтоўкай жанчыны да таго, каб не было разрываў, ніхто не займаецца, — кажа маладая мама.

Чатыры месяцы таму ў Асі нарадзілася малодшая дачка Ангеліна. Гэтым разам у радзільню жанчына прыехала падрыхтаваная — з «планам родаў». Яе знаёмая раней таксама нараджала такім чынам, і, паразмаўляўшы з ёй, Ася вырашыла скласці свой план.

— Я адчула, што не першая прыехала ў радзільню з планам. Да яго я яшчэ прыклала раздрукоўку свайго электроннага звароту ва ўпраўленне па ахове здароўя аблвыканкама. У прыёмным пакоі «план родаў» успрынялі добра. Толькі папрасілі падпісаць дакумент, што я згодная на ўсе медыцынскія ўмяшанні. Я сказала, што не падпішу, зраблю гэта пасля, у выпадку, калі яны мне спатрэбяцца. Перад родамі ўвесь медперсанал схіліўся над сталом і дружна чытаў мой дакумент. З ім азнаёмілася і ўрач. Усе рэагавалі станоўча.

Але гэтым разам роды пайшлі па іншым сцэнарыі.

— Сэрцабіцце плода падчас схватак пачало падаць. І ўрач сказала мне, што можа прапанаваць толькі кесарава сячэнне. Я адразу пагадзілася, бо ўсведамляла, што не магу рызыкаваць сваім дзіцем. Прапанавалі і варыянты анестэзіі — эпідуральны і агульны наркоз у выпадку, калі будзе пагаршэнне. У выніку пагаршэння не было, і я знаходзілася ў прытомнасці падчас аперацыі. Мне расказвалі ўсё, што адбываецца. Урач папярэдзіла таксама, што не зможа выканаць яшчэ адзін пункт плана — не абразаць адразу пупавіну. У выніку ўсё прайшло добра.

Параўноўваючы свой вопыт, жанчына прызнаецца, што з «планам родаў» было іншае стаўленне медперсаналу: з ёй лічыліся і інфармавалі пра ўсе маніпуляцыі.

— Пасля аперацыі я знаходзілася ў рэанімацыі, і мне адзінай з усіх, хто там быў, прыносілі дзіця на кармленне — нячаста, усяго тры разы на суткі, але і гэта важна. Магчыма, таксама дзякуючы плану.

Жанчына прызнаецца, што калі яшчэ давядзецца нараджаць, рабіць гэта будзе толькі з планам.

— Жанчынам не трэба баяцца складаць «план родаў», ён служыць для таго, каб урачы ведалі пра нашы жаданні. У вас заўсёды будзе магчымасць пазнаёміцца з магчымымі варыянтамі і штосьці змяніць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Фота БелТА.

Акушэрка з 36-гадовым стажам:

## «Жанчыне важна ведаць, што медперсанал гатовы яе пачуць»

Таццяна Зянькевіч мае 40-гадовы стаж у медыцыне. З іх 36 гадоў яна працавала акушэркай у Мінскім абласным клінічным радзільным доме. Сёння яна працуе ў 37-й гарадской паліклініцы Мінска. Таксама з'яўляецца аўтарам праграмы «Роды без страху» і 20 гадоў выкладае на курсах па падрыхтоўцы да родаў. Спецыяліст падзялілася сваім меркаваннем наконт таго, ці патрэбны ў радзільнях «план родаў». Яна ўпэўнена, што надышоў час змяніць пэўныя рэчы ў сістэме родадапамогі. І вітае, што такая ініцыятыва сёння ідзе ад саміх жанчын, якія ўсё часцей прыязджаюць у радзільні са сваімі пажаданнямі, аформленымі ў план.

— За апошнія 40 гадоў сістэма родадапамогі ў нас не моцна змянілася. Адзінае істотнае нававядзенне — сумеснае знаходжанне маці і нованароджанага. Прычым спачатку былі меркаванні, што гэта нельга рэалізаваць ва ўсіх радзільнях, ва ўсіх аддзяленнях. Але, як паказала практыка, усё магчыма. Для гэтага нават не давялося ўкладаць вялікія сродкі.

Таццяна Зянькевіч кажа, што ў Беларусі пабудаваны выдатныя перынатальныя цэнтры, аснашчаныя сучасным абсталяваннем. Але для жанчыны патрэбна не толькі гэта:

— Жанчыне падчас родаў важная сама атмасфера, якая мусіць быць камфортнай. Ёй ніхто не павінен перашкаджаць, у тым ліку медперсанал. Нездарма большасць родаў адбываецца ўначы, калі цела расслабляецца. Не трэба злоўжываць стымулятарамі. У арганізме кожнай жанчыны выпрацоўваецца гармон аксітацын, які стымулюе скарачэнне маткі. Сінтэтычныя прэпараты не даюць такога эфекту. Таму калі жанчына жадае, каб роды адбываліся максімальна фізіялагічна, — яна мае рацыю.

Спецыяліст упэўнена, што на родах павінен прысутнічаць і тата, і такі пункт плана таксама апраўданы:

— Некаторыя кажуць, што народзяць і так, без партнёра. Але лепш, чым муж, жанчыну падчас родаў ніхто не падтрымае. Праведзена шмат даследаванняў аб сувязі дзіцяці і бацькоў у першыя гадзіны пасля родаў. На маю думку, партнёрскія роды павінны быць даступныя не толькі тым, хто можа заплаціць, — іх варта было б зрабіць бясплатнымі для ўсіх ахвотных. У першыя дзве гадзіны нованароджаны ўвогуле

**«Жанчыне падчас родаў важная сама атмасфера, якая мусіць быць камфортнай. Ёй ніхто не павінен перашкаджаць, у тым ліку медперсанал».**

павінен быць неразлучны з мамай, а яшчэ лепш — з абодвума бацькамі. Найбольшы выкід гармону аксітацыну адбываецца ў момант нараджэння дзіцяці, важна, каб сям'я ў гэты час была разам. Гэта ўмацуе адносіны і зменшыць колькасць пасляродавых ускладненняў. Грудное кармленне стымулюе выпрацоўку пасляродавага аксітацыну, які дапамагае скараціць матку і спыніць кровацячэнне.

Спецыяліст упэўнена, што роды, якія працякаюць без ускладненняў, можа прыняць і акушэрка, а не ўрач.

— Шпіталізаваць жанчыну за тыдзень да родаў — гэта раскоша, якую не дазваляюць сабе іншыя краіны. На роды жанчына павінна прыязджаць у добрым настроі з дому. У нас падчас родаў каля кожнай парадзіхі стаіць доктар. У Францыі, Галандыі, Канадзе, ЗША у жанчыны ёсць выбар: нараджаць з доктарам ці акушэркай.

Адпаведна, і партнёр, і жанчына павінны рыхтавацца да родаў, наведваць курсы, каб ведаць элементарныя рэчы: як правільна дыхаць падчас схваткі, як не нашкодзіць свайму целу.

Таццяна Зянькевіч згадвае, што першыя роды «па плане» ў яе практыцы адбыліся яшчэ ў 2010 годзе. У дакуменце ў жанчыны было 10 пунктаў, сярод якіх — пажаданні адразу пакінуць дзіця з маці, прыкласці да грудзей, не закапваць нованароджанаму вочкі, не змываць першародную змазку, паслед аддаць маці. Не ўвесь персанал тады ўспрыняў гэта адназначна. Сёння дзякуючы праекту «Радзіны», з'яўленню «руху доўл» ды і таму, што жанчыны ведаюць, як нараджаюць у іншых краінах, «план родаў» ужо нікога не здзіўляе.

— Гэты дакумент дае жанчыне магчымасць узяць адказнасць на сябе. Пры гэтым задача ўрача — растлумачыць магчымыя варыянты развіцця падзей. Такім чынам, жанчына будзе ведаць, што ў яе ёсць выбар і медперсанал гатовы яе пачуць. Гэта дае неабходную ўпэўненасць, спакой і зусім іншае стаўленне да родаў. Сёння свет імкліва мяняецца, варта мяняць і родадапамогу. Важна ведаць патрэбы кожнай жанчыны, бо ў родах — яна галоўная.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ДЗЕЦІ Ў ІНТЭРНЭЦЕ

## Кібербулінг, грумінг, сексцінг, шантаж... І гэта далёка не ўсе пагрозы...

**Дапамагала неяк свайму сыну-другакласніку падрыхтаваць даклад пра беларускія святы. Адкрываю інтэрнэт, малы круціцца побач, і калі бачыць, як на старонцы загружаецца нейкая рэклама, выдае: «Тут, напэўна, пра секс будзе...». У паніцы спрабую высветліць, што маё сямігадовае дзіця паспела ўжо «нарыць» у сеціве і наколькі «адукавалася», прашу патлумачыць мне, адсталай, што такое секс. Здзіўленае дзіця вучыць: «Ну, гэта калі голыя цёткі танцуюць»...**
**— А калі голыя мужчыны танцуюць, гэта секс?**
**— Не, гэта, напэўна, не секс, — заключае малы.**
**На гэты раз я расслаблена выдыхаю — нічога дрэннага яшчэ не здарылася, малога проста крыху «адукавалі» ў далікатнай тэме больш «прасунутыя» аднакласнікі. Да парнасайтаў ён яшчэ не дабраўся. Але адчуваю, што вольны доступ да інтэрнэту — не такая ўжо бяскрыўдная рэч, і пачынаць клапаціцца пра бяспеку дзяцей у сеціве трэба было адразу пасля таго, як малое атрымала доступ да гаджэтаў.**

### ШКОДНЫ КАНТЭНТ

Псіхолагі і медыкі шмат гавораць пра тое, што дзеці, якія гадзінамі завісаюць у інтэрнэце, атрымліваюць праблемы са зрокам і пазваночнікам, страчваюць схільнасць да жывых зносін, становяцца замкнёныя, агрэсіўныя, няздольныя прымаць паражэнні (у камп'ютарных гульнях пры няўдачах заўсёды можна перазагрузіцца). Сапраўды, інтэрнэт ужо сам па сабе тоіць пагрозу, уплывае на тое, як дзіця ўспрымае свет. Насцярожвае нават, калі малыя пільна сочаць за фоткамі равеснікаў ці моладзі. Дзіця настройваецца на тое, што галоўнае ў жыцці — добра выглядаць. А як жа матывацыя на вучобу, памкненні чаго-небудзь дасягнуць, дапамагчы іншым? Можа, лепш усё ж «сядзець» з дзецьмі ў інтэрнэце разам, вучыць, як карыстацца гэтым рэсурсам, дзяліцца адно з адным цікавымі звесткамі, шукаць адказы на пытанні? Уласна, такія прапановы для бацькоў я чула на майстар-класах па інтэрнэт-бяспецы. Менавіта так ствараюцца даверлівыя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, выпрацоўваецца культура работы з сецівам, а мамы і таты да таго ж паказваюць такім чынам, што яны не імкнуцца да кантролю дзіцяці, а проста хочуць засцерагчы яго ад небяспекі. Каб абараніць дзіця ад непажаданага кантэнту (напрыклад, у ім могуць быць страшныя малюнкі, катастрофы, паказаныя буйным планам, жорсткія сцэны, гвалт), такая прадукцыя пазначаецца асаблівымі значкамі накшталт 12+, 18+. І тут ужо адказнасць за прагляд гэтых фільмаў і перадач ускладаецца на бацькоў. Менавіта яны вырашаюць, ці дазволіць сваім малым праглядаць падобнае.

**Усё больш татаў і мам схіляюцца да неабходнасці ўстаноўкі «бацькоўскага кантролю» — спецыяльных праграм, якія фільтруюць небяспечную, шкодную «дарослую» інфармацыю.**

### ХТО ВІНАВАТЫ?

Вывучаць інфарматыку школьнікі пачынаюць толькі ў шостых класах. А вось лазіць па сеціве многія дзеці прыахвочваюцца ўжо з дашкольнага ўзросту. Гэта ж колькі бед можна нарабіць! Нават нявінны жарт (а не ўсе дзеці здольныя вызначыць меры дазволенага) можа стаць падставай для таго, каб юны хакер патрапіў на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх. Дзеці могуць выкласці ў інтэрнэт непрыстойныя здымкі, нанесці крыўду сваім знаёмым. Нават «фотажаба», калі твар канкрэтнага дзіцяці спалучаецца з «цікавым» малюнкам з сеціва, ужо можа стаць падставай для пастаноўкі на ўлік... Так было ў класе майго сына — бацькі пакрыўджанага хлопчыка напісалі скаргу ў міліцыю...

Хакерства маладзее. У сярэднім штогод каля 30 непаўналетніх прыцягваецца да адказнасці па адпаведных крымінальных артыкулах. І не трэба думаць, што ў сеціве лёгка «згубіцца». Напрыклад, праваахоўным органам удалося знайсці падлетка, які з дапамогай камп'ютарных тэхналогій здымаў грошы з банкаўскіх картак уладальнікаў, што пражывалі на тэрыторыі Італіі і ЗША.

Падлеткаў могуць уцягнуць у групы, звязаныя з распаўсюджваннем наркотыкаў ці парнаграфічнай прадукцыі. Дзеці не ведаюць, што нават ставіць лайкі, рабіць каментарыі ці рэпосты на сайтах з непрыстойнай ці шкоднай інфармацыяй небяспечна. Калі, напрыклад, падлетак скапіруе відэаролік ці фатаграфію парнаграфічнага характару, размесціць яе на сваёй старонцы ці проста перашле сябрам, ён ужо здзейсніць супрацьпраўныя дзеянні. І нават калі дзіця яшчэ не дасягнула ўзросту, у якім яно можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, без праблем не абысціся. Юнага парушальніка могуць паставіць на ўлік у інспекцыі па справах непаўналетніх.

Існуе адказнасць і за ўзлом старонак іншых карыстальнікаў і далейшае распаўсюджванне іх інфармацыі ў непрыстойным выглядзе. З кібербулінгам — здзекамі і распаўсюджваннем ганебных чутак пра дзіця — можна і трэба змагацца. Найперш ахвярам ці іх бацькам важна захаваць такія матэрыялы, зрабіць скрыншот, раздрукаваць, звярнуцца ў міліцыю ці да адміністратара інтэрнэт-рэсурса з просьбай заблакаваць гэтыя матэрыялы, але не выдаляць, каб пасля іх можна было выкарыстоўваць у якасці доказу. Калі здзекі ці пагрозы (што прыходзяць дзіцяці на тэлефон ці ў месенджары) носяць рэгулярны характар, можна звярнуцца ў праваахоўныя органы, да псіхолага, сацыяльнага педагога, класнага кіраўніка і нават да бацькоў крыўдзіцеляў. Часам агрэсары пачынаюць ставіць перад ахвярай умовы. Маўляў, калі не прынясеш грошай ці не здзейсніш пэўных дзеянняў, у сеціве будуць з'яўляцца новыя фота і відэаролікі пра цябе.

### КАНТАКТНАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ

Вельмі складана адсачыць, хто з інтэрнэту набіваецца ў сябры да вашых дзяцей. Варта паспрабаваць навучыць сваіх малых, як адрозніваць фэйкавыя акаўнты. Такую інфармацыю можна атрымаць на занятках ці адкрытых уроках, майстар-класах у IT-школах, часам грамадскія арганізацыі выступаюць з ініцыятывамі па навучанні дзяцей такім ведам. У сваю чаргу, у далейшым самі дзеці праводзяць гутаркі па інтэрнэт-бяспецы сярод равеснікаў.

Папярэдзьце дзяцей, што нельга выкладваць у інтэрнэце ўсю інфармацыю пра сябе. Зламыснік без праблем можа сабраць дасье на патэнцыйную ахвяру, праз дзіцячыя старонкі ён даведаецца, дзе вучыцца дзіця, у якія гурткі і нават у які час ходзіць, калі сям'я з'язджае і кватэра застаецца без нагляду, а па фатаграфіях нават зробіць уяўленне пра ўбранне пакояў і заробкі бацькоў. Зладзеі могуць выкарыстоўваць усю гэту інфармацыю і для шантажу ахвяры.

Часам падлеткі рассылаюць адно аднаму інтымныя фота (сэксцінг), чаго ні ў якім разе рабіць нельга. Немагчыма прадугледзець, каму пасля трапіць падобнае фота. Дарэчы, у шэрагу замежных краін здымкі і распаўсюджванне падобных карцінак з'яўляюцца крымінальным злачынствам.




Яшчэ горш, калі падобнымі фатаграфіямі дзеці абменьваюцца з «інтэрнэт-знаёмымі» — грумінг (распусныя дзеянні, схіленне непаўналетніх да сексуальных дзеянняў пры дапамозе сеціва). Тут ахвяр доўгі час могуць абходжваць, а калі ўзнікаюць сяброўскія адносіны ці закаханасць, зламысніку лёгка кіраваць падлеткамі. Пры гэтым ахвяры нават не адчуваюць уздзеяння, не разумеюць, што імі маніпулююць. Быццам усё адбываецца без прымусу. Маладзенькія дзяўчаткі самі могуць дасылаць сваім інтэрнэт-бойфрэндам інтымныя здымкі, ісці на спатканні...

Часам да дзіцяці можа «пастукацца» ў сацыяльныя сеткі (напісаць у месенджар, звярнуцца ў чаце, у анлайн-гульнях) «равеснік». Зламыснік можа выкарыстаць як падставу для знаёмства з дзяўчынкай, напрыклад, той «факт», што ў яго такое ж імя і прозвішча. Далей дзеянні могуць разгортвацца вельмі хутка. Новая «сяброўка» можа даслаць свае фрывольныя здымкі, прапанаваць пасваволіць — паздымацца голымі. Часта злодзей «апрацоўвае» дзяцей, якія аб'яднаны ў адной інтэрнэт-групе. Як толькі злачынец атрымлівае кампраметуючы матэрыял, ён пачынае шантажаваць ахвяру, запужваць, патрабаваць новых фота і відэа, схіляць да сексуальнага кантакту. Калі дзіця трапіла ў падобную біду, абавязкова звяртайцеся ў праваахоўныя органы. Так вы не толькі абароніце сваіх дачок і сыноў, але і не дасце злачынцу распаўсюдзіць падобную інфармацыю і прынесці шкоду іншым сем'ям. Варта патэлефанаваць бацькам дзяцей, з якімі ваша дзіця сябруе ў сацыяльных сетках, каб прадухіліць небяспеку.

**Зламыснік без праблем можа сабраць дасье на патэнцыйную ахвяру, праз дзіцячыя старонкі ён даведаецца, дзе вучыцца дзіця, у якія гурткі і нават у які час ходзіць, калі сям'я з'язджае і кватэра застаецца без нагляду.**

### ПРОСТЫЯ ПРАВІЛЫ

Кіберзлачынцы не прапусцяць і магчымасці абрабаваць дзяцей, асабліва калі ў тых ёсць персанальныя карткі. Малым, калі яны карыстаюцца гаджэтамі, могуць прыйсці паведамленні, што яны атрымаюць выйгрыш, ці прапановы паўдзельнічаць у розыгрышах, але для гэтага спачатку трэба пералічыць пэўную суму. Часам дзеці падпісваюцца на платныя рэсурсы, адпраўляюць платныя СМС. Дамоўцеся з малымі, што яны без вашага ведама не будуць нікому пераводзіць грошы, здзяйсняць інтэрнэт-куплю і ўдзельнічаць у сумнеўных латарэях і аўкцыёнах, выкарыстоўваць платныя рэсурсы для накруткі лайкаў. Бацькам трэба паклапаціцца і пра бяспечны доступ у інтэрнэт: устанавіць антывіруснае праграмнае забеспячэнне, блакіроўшчыкі рэкламы, бяспечныя браўзеры, не забывацца на абнаўленне праграмнага забеспячэння. Усё больш татаў і мам схіляюцца да неабходнасці ўстаноўкі «бацькоўскага кантролю» — спецыяльных праграм, якія фільтруюць небяспечную, шкодную «дарослую» інфармацыю. Нядрэнна будзе, калі вы дапаможаце дзіцяці стварыць бяспечны акаўнт. Так, пароль павінен утрымліваць 8-12 сімвалаў. Пажадана, каб у ім былі лічбы і літары рознага памеру, сімвалы накшталт зорачкі або рашоткі. Пароль не павінен складацца з сімвалаў ці літар, якія размяшчаюцца на клавіятуры ў радок ці слупок, дрэнным будзе пароль са слова, імя, прозвішча, даты нараджэння. Ды і сакрэтнае пытанне, якое вы выкарыстоўваеце пры ўстаноўцы пароля, нідзе не павінна быць «засвечана» дзіцем на яго прыватных старонках.

Важна ведаць і пра тое, як злачынцы ўзломваюць акаўнты. Напрыклад, яны могуць гэта зрабіць, калі чалавек карыстаецца бясплатным Wi-Fi. А ці ведае ваша дзіця пра фішынг? Трэба быць уважлівым, каб не натрапіць на сайты, якія капіруюць старонкі папулярных рэсурсаў — адрознівацца яны могуць усяго адной літаркай у назве сайта (напрыклад, замест раскручанага рэсурсу «УКантакце» вы можаце выйсці на яго двайнік vkk.com). І самае галоўнае, набіваючы гаджэт, не забудзьце сказаць дзіцяці, каб яно ніколі не саромелася папрасіць аб дапамозе, калі нешта пойдзе не так.

**Ганна ТРОШЫНА.**

Запрашальнік

## З варагаў у грэкі. З прыпынкам у Полацку

**Захапляльная бітва на дракарах, майстар-класы старажытных рамёстваў, сярэднявечная музыка і кухня, а таксама 3D-шоу на сценах Сафійскага сабора... Усё гэта вы прапусціце, калі не пабываеце ў апошнія дні лета ў Полацку. 30 жніўня тут пачнецца першы Міжнародны фестываль «На шляху з варагаў у грэкі», які ладзіцца пры фінансаванні Еўрасаюза.**

Афіцыйна гэта гучыць так: фестываль пройдзе ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Павышэнне канкурэнтаздольнасці і ўстойлівасці турызму ў сферы культуры, садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і гістарычнай спадчыны ў Латвіі, Літве і Беларусі» Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь у межах Еўрапейскага інструмента суседства на 2014—2020 гады. На справе ўсё абяцае адбыцца жыва і цікава.

Заходняя Дзвіна ў раннім Сярэднявеччы была адной з найважнейшых транспартных артэрый Усходняй Еўропы і адыграла вялізную ролю ў развіцці рэгіёна. Так што не выпадкова менавіта на яе ўзбярэжжы 30 жніўня — 1 верасня збяруцца прадстаўнікі некалькіх суседніх краін. «Чакаем калектывы з Украіны і Расіі, каля 100 чалавек прыедзе з краін — партнёраў праграмы — Латвіі і Літвы, і не менш чым 200—300 удзельнікаў будзе з Беларусі», — расказала «Звяздзе» **галоўны спецыяліст аддзела спорту і турызму Полацкага райвыканкама Наталля СІНІЦА,** анансуючы блізкае свята.

Над тым, каб акунуць гасцей у атмасферу Сярэднявечча, працуе вялікая міжнародная каманда. Напрыклад, народны тэатр «Полацкі звяз» прадставіць рэканструкцыю не толькі касцюмаў, спеваў і танцаў, але і гастранамічных традыцый — у праграме свята запланаваны дэгустацыі і цыкл кулінарных лекцый, аўтары якіх апавядуць і пра першую беларускую гарэлку, і пра клёцкі з душамі, і пра мніхі з сырам і іншыя стравы паўсядзённага і ўрачыстага меню. Рыцарскія клубы з розных краін правядуць турніры, характэрныя для ранняга і позняга Сярэднявечча. Рамеснікі запросяць гасцей на майстар-класы па цяслярстве і апрацоўцы скуры, ткацтве, вырабе свечак і берасцяных грамат, ліцці з волава. А паблізу прыстані на Заходняй Дзвіне разгорнуцца рэгата і тэатралізаваная бітва з захопам дракара.

Батлейка, сярэднявечныя атракцыёны і забавы, паказ старажытнай еўрапейскай моды, вулічныя тэатры, жывая музыка, карчма і фотапляцоўка — сумна палачанам і гасцям у гэтыя дні дакладна не будзе. А ўвачы 31 жніўня ўпершыню ў Полацку — а можа, і ў Беларусі — найбольш важныя і цікавыя гістарычныя сюжэты пакажуць у светлавым 3D-шоу «Старажытны Полацк», якое спраецыруюць проста на сцены велічнага Сафійскага сабора. Словам, арганізатары абяцаюць, што будзе гучна, ярка і смачна, — праверым?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Радавод

# КАРЭННАЕ ПЫТАННЕ

## Навошта і як складаць сваё генеалагічнае дрэва

**У наш час, калі людзі з лёгкасцю пераадольваюць акіяны, маюць доступ амаль да любой інфармацыі і заводзяць дзясяткі, а то і сотні тысяч знаёмстваў, вельмі лёгка страціць разуменне таго, кім мы з'яўляемся насамрэч. Што рабіць, каб гэтага не адбылося, «Звяздзе» расказаў кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Нацыянальнага архіва Беларусі і мадэратар партала radawod.by Вадзім УРУБЛЕЎСКІ.**

### АД ПРАДЗЕДАЎ СПАКОН ВЯКОЎ...

— Як правіла, генеалогіяй людзі пачынаюць цікавіцца ў сталым узросце. Чаму? Моладзь заўсёды глядзіць наперад, у будучыню. Для яе важна будаваць планы, займацца вучобай, сацыялізацыяй, работай і стварэннем сям'і. Пра мінулае большасць пачынае задумвацца тады, калі жыццё пераходзіць за экватар. У галаве ўзнікаюць пытанні накшталт: «Ці ўспомняць пра мяне пасля смерці? Калі ўспомняць, дык што? А што я ведаю пра папярэднікаў?» Гэта і не толькі прыводзіць многіх людзей да пошукаў інфармацыі пра ўласных продкаў, — расказвае Вадзім. — Але азірнуцца назад карысна кожнаму ў любым узросце. Гэта варта рабіць хоць бы для таго, каб лепш разумець, кім мы з'яўляемся. Не сакрэт, што чалавек — гэта ў тым ліку спалучэнне розных знешніх якасцяў, рыс характару, манер паводзін і здольнасцяў ад пакаленняў папярэднікаў. Знакамітае выказванне «Гены пальцам не раздушыш» якраз ад гэтага і пайшло.

Па словах гісторыка, дасканалае веданне свайго роду дазваляе пазбегнуць непаразуменняў.

— Напрыклад, я не здзіўлюся, калі ў мяне з'явяцца дзеці з рудымі валасамі. Хоць у жонкі, у мяне, у нашых бацькоў і бабуль з дзядулямі яны іншых колераў. Аднак мой прадзед быў руды, таму ёсць імавернасць, што гэты ген проста «спіць» унутры і чакае свайго часу.

Акрамя таго, Вадзім зазначае, што знаёмства з эпізодамі жыцця сваіх продкаў дазваляе па-іншаму зірнуць і на ўласнае існаванне. Рэч у тым, што кожнае пакаленне мяркуе, быццам яно жыве ў няпросты час. Нават цяпер, калі ў цэлым усё нядрэнна, людзі не перастаюць скардзіцца: калі не на рост цэн, дык на сацыяльны лад ці змяненне клімату і іншае. Але ўсё пазнаецца ў параўнанні. На долю нашых продкаў выпадалі сапраўды сур'ёзныя выпрабаванні — сусветныя войны, эпідэміі, голад.

— Некаторыя людзі сваю абыякавасць да радаводу спрабуюць прыкрыць ідэямі накшталт: «Усе мы адно аднаму браты». На жаль, ёсць і тыя, хто, нават маючы магчымасці, наўмысна адмаўляецца ад пошуку інфармацыі пра сям'ю. Прычына — боязь даведацца праўду, якая можа не спадабацца. Аднак у любым выпадку саромецца варта не таго, кім былі твае продкі, а бязроднасці, — упэўнены Вадзім. — Сама гісторыя чалавецтва падказвае: тое, як нас будуць помніць, залежыць ад таго, наколькі мы самі памятаем сваіх продкаў.

### ХТО Я ЁСЦЬ

Праблема яшчэ і ў тым, што за XX стагоддзе беларусам некалькі разоў даводзілася перапісваць сваю гісторыю нанова. Так, пасля рэвалюцыі было небяспечна мець шляхецкія карані або быць выхадцам з сям'і заможных сялян ці святароў. Распад Савецкага Саюза прывёў да таго, што людзі імкнуліся як мага хутчэй забыцца пра сваякоў, якія, напрыклад, служылі ў НКУС.

— У наш час на розных узроўнях усё больш кажуць пра самасвядомасць нацыі, падкрэсліваюць важнасць нацыянальнай ідэнтычнасці. У гэтым пытанні надзвычай карысна, каб кожны спачатку вызначыўся: кім я з'яўляюся? А пасля перайшоў да разгляду свайго роду ў кантэксце народа, — кажа гісторык. — Нельга сказаць, што запатрабаванасць складання радаводаў — здабытак нашага часу. Так, апошнім часам назіраецца ўсплёск цікавасці да гэтай тэмы. Але дастаткова ўспомніць часы, калі існавала шляхта, і стане зразумела: ужо тады гэта быў трэнд. Кожны паважаючы сябе род меў не толькі свой герб, але і сямейны архіў з радаводам. Нават сем'і інтэлігентаў у дарэвалюцыйным Мінску мелі звычку заводзіць сямейныя фотаальбомы. Пэўны крызіс сямейных каштоўнасцяў у савецкі час прывёў да забыцця. Але хочацца верыць, што з кожным годам цікавасць да шматграннай гісторыі сваёй сям'і расце.

Многіх цікавіць пытанне: наколькі глыбока можна дакапацца, калі твае продкі не былі Радзівіламі ці Сапегамі? «Усё залежыць выключна ад упартасці таго, хто шукае», — абнадзейвае Вадзім. Складваючы ўласны радавод, ён паглыбіўся аж да канца XVII стагоддзя!

— Мой далёкі продак Якуб Урублеўскі нарадзіўся каля 1670 года на сучасных літоўскіх землях. Яго нашчадкі жылі на памежжы сучасных Беларусі, Латвіі і Літвы. Атрымалася ўстанавіць, што ў Мінску Урублеўскія абасналіся пасля Першай сусветнай вайны. Таму, прадстаўляючыся, магу ўпэўнена казаць: «Мінчанін у пятым пакаленні». Як і многія іншыя сем'і, нашу закранулі рэпрэсіі і Вялікая Айчынная вайна. Цікава, што амаль усе мужчыны ў родзе Урублеўскіх былі чыгуначнікамі і кіроўцамі. Я першы, хто абраў шлях гуманітарыя.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Многія ў дарослым узросце шкадуюць пра тое, што мала цікавіліся жыццём бабуль і дзядуляў, калі была магчымасць.**

### ДЗЕ І ЯК ШУКАЦЬ ПРОДКАЎ БЕЛАРУСАМ?

— Як бы дзіўна гэта ні прагучала, пачынаць пошукі варта з сябе самога. Многія думаюць, што старт генеалагічнага квэста — архіў. Але туды трэба звяртацца ў апошнюю чаргу. Перш за ўсё неабходна проста падумаць і запісаць усё, што ведаеце пра сваю сям'ю: імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, мянушкі, даты нараджэння і смерці, прафесіі, канфесіянальную прыналежнасць, месцы жыхарства.

На пачатковым этапе важна прагледзець усе дакументы і фота, якія знаходзяцца дома. Варта зазірнуць на лецішча, куды вы маглі вывезці «багаж» ад папярэднікаў. Не забывайцеся пра размовы з бабулямі і дзядулямі. Вы нават можаце не здагадвацца, колькі яны ўсяго ведаюць. Варта толькі запытаць! Калі нікога са старэйшага пакалення не засталося, можна пашукаць іх калег ці сяброў.

Вадзім звяртае ўвагу, што не трэба недаацэньваць могілкі. Пліты і крыжы падкажуць важныя звесткі: напрыклад, імёны па бацьку, даты нараджэння і смерці. Да таго ж раней сваякоў хавалі побач, таму ёсць усе шанцы знайсці братоў ці сясцёр сваіх продкаў.

— У архівах можна знайсці толькі тое, што магло цікавіць дзяржаву. Гэта афіцыйныя дакументы — перапіс насельніцтва і матэрыялы сакральнай накіраванасці. Напрыклад, метрычныя кнігі з датамі нараджэння (хрышчэння), смерці, заключэння шлюбаў, пераходаў з адной веры ў іншую. Ёсць у архівах і такія цікавыя дакументы, як «перадшлюбныя вобыскі». У дарэвалюцыйныя часы святары правяралі, ці не даводзіліся жаніх з нявестай адно аднаму сваякамі, і складалі па выніках дакумент.

Што датычыцца пошукаў у інтэрнэце: ужо працуюць сайты з базамі даных, якія змяшчаюць звесткі па масавай генеалогіі перыяду XX стагоддзя, ствараюцца формы, сістэматызуецца вядомая мемуарная літаратура.

Сайты *gwar.mil.ru, obd-memorial.ru, podvignaroda.ru* будуць карысныя для ўсіх, хто страціў сваякоў падчас Першай і Другой сусветных войнаў. Там ёсць звесткі пра загінулых, тых, хто знік без вестак, быў адпраўлены ў шпіталь, трапіў у палон, атрымліваў узнагароды і іншае. Інфармацыя пра рэпрэсаваных будзе на сайтах *dostup.memo.ru, poslednyadres.ru, lists.memo.ru*.

Калі маеце расійскія карані, то вам сюды — *www.vgd.ru*. Польскія продкі знойдуцца на szukajwarchiwach.pl і *www.agad.gov.pl*. Яўрэйскіх сваякоў можна адшукаць тут — *www.jewishgen.org*.

Напрыклад, партал Нацыянальнага архіва Беларусі — *archives.gov.by*. Сюды варта зазірнуць, каб даведацца, у які канкрэтна архіў краіны вам трэба ісці. На сайце дзейнічае сістэма «Дапаможнік» (шукаць на ўкладцы «Генеалогія») і «Фондавы каталог».

Акрамя таго, карысна зазірнуць на партал аб мінскіх некропалях — pomnim.by і ў базу дзённікаў XX стагоддзя — *prozhito.org*.

**Ганна КУРАК.**

### У пошуках страчанага

Сёння ў Беларусі існуе некалькі праектаў, якія дапамагаюць не толькі знайсці продкаў, але і ўпарадкаваць інфармацыю пра іх.

Напрыклад, **школа практычнай генеалогіі пры храме Мікалая Японскага ў Мінску.** Тут бясплатна вучаць працаваць з архівамі, шукаць інфармацыю ў інтэрнэце і дзяліцца сакрэтамі, якія дапамогуць не заблытацца ва ўласных сваяках. Прыемны бонус — арганізатары запрашаюць спікераў па асобных тэмах і ладзяць незвычайныя экскурсіі. Заняткі праводзяцца па дарослых і праводзяцца двойчы на месяц з верасня да мая. Для сувязі пісаць: slepovron@mail.ru (Урублеўскі Вадзім Валер'евіч).

**Беларускі архіў вуснай гісторыі** займаецца захаваннем звестак, якія літаральна перадаюцца з вуснаў у вусны. Тут увага акцэнтуецца не на агульнай інфармацыі пра чалавека, а на дробязях біяграфіі. Напрыклад, нашы бабулі і дзядулі, якія нарадзіліся ў першай палове XX стагоддзя, могуць падзяліцца не толькі ўспамінамі пра Вялікую Айчынную. Магчыма, яны ўдзельнічалі ў аднаўленні гарадоў ці станаўленні гаспадаркі на вёсцы. Цікава даведацца пра службу ў арміі на Далёкім Усходзе ці ў Сібіры. Дарэчы, на старых здымках мы бачым не толькі нашых сваякоў, але і іх акружэнне, побыт. Аматары вуснай гісторыі ўпэўнены, што ўсё гэта таксама важна захаваць.

**Гуртак «Радавод» на гістарычным факультэце БДУ** займаецца папулярызацыяй генеалогіі сярод беларусаў. На занятках прысутнічаюць найлепшыя беларускія спецыялісты па складанні радаводаў. Таму заўсёды ёсць магчымасць задаць ім пытанні. Калі ў цэлым цікавіцеся гісторыяй краіны, то вам таксама сюды. Гуртак запрашае на сустрэчы гісторыкаў, літаратараў, навукоўцаў, якія робяць экскурс у мінулае і раскрываюць генеалагічныя сакрэты знакамітых беларусаў.

# «Пакуль жывыя нашы бацькі...»


З калегамі па «Добрай раніцы, Беларусь!», у цэнтры — бацька тэлевядучай Аляксей Пятровіч.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**Святлана Бароўская:** — Старэйшы сын нарадзіўся, калі я была студэнткай. Гадаваць дзяцей мне вельмі дапамагалі бабулі. Сын Вова ўсё лета праводзіў у мамы мужа на Каўказе. Але гэта не значыць, што мы «падкінулі» дзяцей старэйшаму пакаленню. Перад вачыма быў прыклад маіх бацькоў, калі яны кожныя выхадныя прыязджалі з гасцінцамі ў вёску, дзе я праводзіла канікулы. Так і мы: пры першай жа магчымасці — да дзяцей. А розніца ва ўзросце — выдатна! Валодзя адводзіў Кліма ў садок, потым у школу. А я з тэлевізара нагадвала, што старэйшы брацік надзявае малодшаму рукавічкі, бярэ за ручку і вядзе ў школу.

***— Кажуць, што для выхавання дзяўчынкі больш важны бацька, каб яна потым выбірала ў жыцці «правільных» мужчын, а для хлопчыка — маці, менавіта зносіны з ёй вучаць разумець жанчын.***

**К. Д.** — Мне здаецца, важна, як абое, маці і бацька, удзельнічалі ў выхаванні дзяцей. Так атрымалася, што Света была адзіная малая ва ўсёй радні, яна такое залюбленае дзіця. Я вельмі за яе дрыжала, аж да таго, што прачыналася ноччу, каб паглядзець, ці дыхае яна. З Русланай была больш спакойнай маці, бо ўжо з'явіўся вопыт.

**С. Б.** — Усім паводзінам у соцыуме мяне навучыла мама, яна мяне выхавала жанчынай у пытаннях дружбы, любові. А тата выхаваў... не выхоўваючы. Напрыклад, усе дзеці прасілі ў бацькоў грошы на марожанае і атрымлівалі 13 або 28 капеек. Мне тата заўсёды даваў рубель. Пры гэтым я ніколі не купляла тры порцыі марожанага адразу, хоць вельмі любіла гэты ласунак і магла сабе дазволіць. Татаў рубель — ён больш, чым магчымасць выбару, якое марожанае купіць. Ён мне дарыў свет. Ведаеце, калі дзеці жывуць у вёсцы, то адно ўспрымае як «сваю» толькі прастору, агароджаную плотам, іншае ж як «сваё» ўспрымае поле, лес, рэчку, усё, што бачыць вакол. Вось менавіта гэта адчуванне, што ўвесь свет належыць мне, дарыў татаў рубель.

У маёй сям'і, мне здаецца, мы зрабілі раўнацэнны ўнёсак у выхаванне сыноў. Ведаю дакладна, што дзеці вельмі любяць нас, асабліва за ранняе дзяцінства. Пры ўсёй загружанасці, мы знаходзілі час для дзяцей. Як мама я задаволеная тым, колькі Толя (Анатоль Кацянёў — акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Беларусі. — **Аўт.**) аддаваў увагі сынам. Памятаю, калі Толя стаміўся гушкаць калыску, то прыдумаў прыладу на аснове гумкі, якая дазваляла падцягваць яе да сябе без дапамогі рук. Нагой адсоўваў — гумкай падцягваў і так люляў.

Або вось яшчэ момант: мы ніколі не прапускалі ранішнікі. Неяк прыйшлі да Вовы, ён чытае вершык, а мы з Толем плачам ад замілавання. Усе людзі як людзі, а мы ў слязах, з хусцінкамі ў руках. З Клімам была іншая гісторыя — ён выступаў, і так атрымлівалася, што яго ўвесь час закрывала дзяўчынка ў ружовай сукенцы. Я ёй шыплю: «Дзяўчынка, адыдзі, калі ласка», а Толя кажа: «Света, як табе не сорамна, у дзяўчынкі ж таксама мама ёсць». Мы былі такія трохі вар'яцкія бацькі.

***— Але цяпер вы мяне папярэдзілі, што сыны прасілі пра іх не асабліва гаварыць і ўжо дакладна — ніякіх фатаграфій.***

**С. Б.** — Яны з'явіліся на свет у сям'і папулярнага артыста, а потым і мама стала вядомай тэлевядучай. З дзяцінства да іх была прыкавана ўвага. Я памятаю, як у скверыку на вуліцы Леніна ў нас бралі інтэрв'ю. Клім не хацеў нічога казаць на камеру, я бачыла, што яму гэта не падабаецца, таму ўсё згарнула. Хлопцы вельмі самастойныя. Нават у паліклініку самі хадзілі ў падлеткавым узросце: «Мама, ты прыйдзеш, усе пачнуць вохкаць-ахкаць, прапускаць па-за чаргой. Мы так не хочам». Школу для дзяцей я выбірала па прынцыпе, каб не трэба было пераходзіць дарогу. Валодзя вучыўся ў звычайнай школе ў Малінаўцы. А Клім ужо ў іншую школу пайшоў, дзе была цудоўная дырэктар Наталля Яўгенаўна. І яна адразу на ўсе мае «ахі» сказала: «Мамаша, ідзіце на работу, а тут я буду займацца». Магу дакладна сказаць, што не статус робіць навучальную ўстанову добрай ці дрэннай, усё залежыць ад людзей, якія там працуюць.



Як толькі сыны сказалі, што больш ніякіх інтэрв'ю і фотасесій, мы не настойвалі. Яны хочуць пражыць сваё жыццё, а не ў цені вядомых бацькоў. Нам жа, канешне, хочацца як мага даўжэй ахінаць дзяцей пуховай коўдрай свайго клопату. Але гэта іх выбар.

***— Хлопцы нават не разглядалі як варыянт акцёрскую кар'еру?***

**С. Б.** — Не. Старэйшы, Валодзя, скончыў БДУ па спецыяльнасці «філасофія». Ён і па складзе характару філосаф. Я ж эмацыянальная, часам штосьці кажу яму, а ён раптам так спакойна: «Мама, сфармулюй пытанне». І ўсё, ён так прыгожа паніжае градус маіх эмоцый. Малодшы, Клім, вучыцца ў лінгвістычным універсітэце. Між іншым, я марыла ў дзяцінстве паступіць у «ін'яз» і быць перакладчыкам. Ведала, што дзяўчынак не вельмі бяруць у перакладчыкі, але была ўпэўненая, што яшчэ і знакамітай стану. Як цікава атрымліваецца: я ажыццявіла матуліну мару стаць актрысай, а мой сын — маю мару вучыцца ў лінгвістычным універсітэце.

***— Вы строгая мама?***

**К. Д.** — Так, напэўна, нават вельмі. Для Светы я ўстанавіла свайго роду камендантцкую гадзіну — у 22.45 трэба было быць дома. Вось яна і бегла з танцаў... Але гэта ўсё не дзеля таго, каб паказаць сваю ўладу над дзіцем. І тым больш не ад недаверу. Гэта ўсё ад страху, каб нічога дрэннага не здарылася з дзіцем. Ведала, што дзяўчынкі разумныя, умеюць сябе паводзіць, але ж людзі вакол не толькі з добрымі намерамі.

З узростам, вядома, стала мудрэйшая і разумею, што не трэба на кожным кроку апекаваць дарослых дзяцей.

**С. Б.** — Наўрад ці строгая. Але я такая мама, якой шмат. Вучуся адпускаць дзяцей ад сябе.

***— Вы сяброўкі?***

**К. Д.** — Не. Я лічу, што маці і дочкі не могуць быць сяброўкамі. Мы вельмі блізкія людзі, якія давяраюць адна адной, могуць гаварыць на розныя тэмы. Раней Света казала: «Не патрэбныя мне, мама, вашы парады», цяпер больш прыслухоўваецца, гэтая фраза ў яе проста знікла. А я рада падзяліцца сваім вопытам. Я вельмі люблю сваіх дзяцей і ўнукаў. Мне па-ранейшаму хочацца дапамагаць ім. Калі ў Светы эфір, я абавязкова правяраю — ці ўсё ў парадку з сукенкай. Кожны год на месяц езджу ў Італію да Русланы. І там таксама дапамагаю, мне ў радасць прыгатаваць для іх вячэру. Прыяцелькі мне часам кажуць: «Навошта табе гэта, пажыві для сябе». Дык я і жыву для сябе! Гэта для мяне важна, каб у маіх дзяцей і ўнукаў усё было добра, каб Света прыйшла з работы, а дома прыгатавана вячэра.

**С. Б.** — Не, мы не сяброўкі. Я выхавана на безумоўным шанаванні старэйшых. Мама можа мне рабіць заўвагі, я ёй — не. Але мы вельмі блізкія, родныя людзі. Я жыву з упэўненасцю: што б ні здарылася, у мяне ёсць мама і тата, і яны заўсёды мяне падтрымаюць і зразумеюць. Нездарма кажуць: пакуль жывыя нашы бацькі, мы — дзеці.

***— Святлана, мне вось як старэйшай сястры ў дзяцінстве здавалася, што бацькі больш любяць малодшую. А вам? І наогул, ці сябруеце вы з сястрой?***

**С. Б.** — Вельмі важная агаворка, што так вам здавалася ў дзяцінстве. Пасталеўшы, я зразумела, што бацькі любілі нас аднолькава моцна, проста па-рознаму, бо і мы не вельмі падобныя. У дзяцінстве мы з Русланкай маглі пасварыцца і нават пабіцца тапкамі дома. А вось калі аднойчы ў школе асмеліліся пакрыўдзіць маю сястру, то я так хватанула яе сяброўку і ўсё ёй патлумачыла... Па-сапраўднаму сябраваць мы пачалі, калі Руслана прыехала вучыцца ў Мінск, яна і жыла ў нас. Вельмі дапамагала мне з маленькім Клімам. Сястра ўжо шмат гадоў жыве ў Італіі, адлегласць зрабіла нас яшчэ большымі сяброўкамі. Раз на год яна абавязкова прыязджае ў Беларусь, а я езджу да яе.


Кацярына Дзмітрыеўна з Русланай і Святланай.

Хоць, напэўна, комплекс старэйшай сястры дзесьці ў глыбіні душы жыве. Гэтай зімой мы з мамай паехалі на дачу. У хаце холадна, растапілі камін. Я пайшла яшчэ па дровы. Заходжу ў дом, а мама грэе коўдру перад камінам, каб мне было цёпла ахінуцца. Уяўляеце, мне 49 гадоў, а мама для мяне грэе коўдру (слёзы на вачах. — **Аўт.**)! Я тады сказала: «Мамачка, як жа ты мяне любіш».

***— Кацярына Дзмітрыеўна, вы сталі бабуляй у 39 гадоў. Напэўна, калі гулялі з унукамі, вас прымалі за іх маму?***

**К. Д.** — Так і было. Калі нарадзіўся Вова, я аформіла на сябе дэкрэтны адпачынак. І добра падрыхтавалася: у мяне была знаёмая краўчыха ў Вільнюсе, яна пашыла мне шыкоўны касцюм. І вось іду я ў ім, горда вязу калыску і атрымліваю столькі кампліментаў менавіта як мама, але з такой радасцю кажу: «Я — бабуля».

